

СУЧАСНЫ ПАШПАРТ. УЖО НАЛЕТА 5

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ Ў СЕЗОН ВРВІ 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ЛІСТАПАДА 2020 г. СЕРАДА № 215 (29329)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ПЕТРАШОВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

*«Унясенне змяненняў у Канстытуцыю — тэма настолькі запатрабаваная ў грамадстве, што дыялогавыя пляцоўкі, няхай і праходзіць працяглы час, усё яшчэ застаюцца актуальныя. Нядзіўна, бо ў абмеркаванні Асноўнага закона дзяржавы могуць удзельнічаць розныя катэгорыі грамадзян. І мы трапятліва ставімся да ўсіх іх прапаноў, бо дыялог — гэта адзіны шлях да нацыянальнай згоды».*

Вытокі малой радзімы

# На жыватворнай Акменіцы



**Браслаўшчына славіцца не толькі маляўнічымі азёрамі, кругагорамі, паўвыспамі і захаванымі помнікамі дойлідства, але і чыстымі крыніцамі. Адна з такіх — крыніца Акменіца, якая знаходзіцца за пятнаццаць кіламетраў на поўнач ад раённага цэнтра. Яна ўпадае ў аднайменную раку, папаўняючы возера Струста.**

Сёння Акменіца мае статус помніка прыроды. Апякуецца крыніцай Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры».

Каля знакамітай крыніцы прайшла фотасесія, у якой паўдзельнічалі супрацоўнікі Браслаўскага музея традыцыйнай культуры Наталля ПАРАХНЕВІЧ *(на фота злева)* і Ларыса ДАРАФЕЙЧЫК. Наталля і Ларыса прадэманстравалі рэканструяваныя строі сярэдзіны XIX — пачатку XX стагоддзя, якія насілі замужнія жанчыны. Ансамбль строю ў тыя часы складаўся з вышытай кашулі, спадніцы, камізэлькі, фартуха, пояса. Сучасныя майстрыхі стараліся не адыходзіць ад традыцыі, улічвалі і адметнасць строю — наяўнасць наміткі.

— З 1995 года ў нашым музеі пачалі вывучаць святочны жаночы касцюм, каб ведаць, у чым яго адрозненне ад строяў іншых этнарэгіёнаў. За аснову бралі ўспаміны жанчын, а таксама дакументальныя крыніцы, — кажа кіраўнік музея Элеанора ЗІНКЕВІЧ, якая сама прымала ўдзел у станаўленні строю. — Пошукі далі плён і, калі канцэпцыю строю ўзгаднілі з Віцебскім абласным метадычным цэнтрам, пачалася рэканструкцыя. Над ёй працавалі майстрыхі Марыя Дворская і Людміла Рулевіч, Эвеліна Друсь, Аліна Чапулёнак, Наталля Парахневіч. У той час наш музейны фонд папоўніўся дзесяццю шыкоўнымі строямі.

На гэтым здымку ансамбль строяў дапаўняюць і ганчарныя вырабы — гарлачыкі альбо крынкі, якія ў свой час былі неад'емнай часткай побыту селяніна. У Браславе працавалі ганчары, і адным з іх была Ніна Кузьмінова — бабуля нашай мадэлі Ларысы Дарафейчык. Сама Ларыса пераняла ганчарную справу сваёй бабулі і шмат гадоў выраблае традыцыйны браслаўскі посуд.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **РУП «Белпошта» арганізуе датэрміновую выплату пенсій і дапамог за 5—9 лістапада.**

• У БДУ пасля рэканструкцыі адкрыты найбуйнейшы ўніверсітэцкі музей землязнаўства ў Беларусі.

• **У Магілёўскім раёне 36 шматдзетных сем'яў атрымалі ключы ад новых кватэр.**



• Напярэдадні Новага года на вуліцах сталіцы з'явіцца 31 ёлка.

• **Узносы страхавых арганізацый у студзені—верасні выраслі на 6,4 %.**

• Авіякампанія «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Рыгу, Талін і Ларнаку да 14 снежня.

• **Аэрадром Орша гатовы да эксплуатацыі.**

ISSN 1990 - 763X

Спадчына

# НА ЎСЕ ПРУЖАНЫ — ПАЛАЦЫК

### Музей-сядзіба, што стала культурным брэндам райцэнтра, зараз дэманструе драўляную ікону XVI стагоддзя «Таемная вячэра» майстра з вёскі Варанілавічы, якую выратавала ад знішчэння мясцовая жыхарка

**Пружаны сустрэлі развітальнай красой і водарам восеньскіх красак. Ад самага вакзала ідзеш тут і адчуваеш асалоду цішы малога горада.**



**Людзей сустракаецца мала, машын пасля ранняй гадзіны пік — таксама. Дык вось ідзеш па гэтым утульным, дагледжаным правінцыйным гарадку... і раптам упіраешся ў старадаўні парк, пасярод якога невялікі сапраўдны палац.**

СТАР. 8

Спажывец

# БУЛЬБУ ЯДУЦЬ, БУЛЬБУ ХВАЛЯЦЬ...

### А калі яна яшчэ фіялетавая або ружовая — дык і дзівяцца

**Наўрад ці сёння беларусы могуць уявіць свой паўсядзённы рацыён без бульбы: мы ўжо паспелі забыць, што на самай справе наш «другі хлеб» — культура заакіянская. Зрэшты, яна так даўно «жыве» на беларускай зямлі (а дакладней, у зямлі), што стала нам родная. Але гаворка не пра гэта. А пра тое, як сучасны свет мяняе погляды на самыя, здавалася б, нязменныя рэчы. Напрыклад, на бульбу.**

Селекцыянеры Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве сёлета перададуць у Дзяржаўную камісію па сартавыпрабаванні новы сорт бульбы — з цёмна-фіялетавай мякаццю.

— Сорт прайшоў поўную схему селекцыйных выпрабаванняў. Цяпер яму трэба прайсці дзяржаўнае сартавыпрабаванне на 12 участках у розных абласцях Беларусі. І калі ён пакажа добрыя вынікі, то будзе ўнесены ў Дзяржаўны рэестр, — распавядае **доктар сельскагаспадарчых навук, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі бульбы Георгій ПІСКУН.**

А ў наступным годзе, кажа Георгій Іванавіч, селекцыянеры плануюць перадаць у Дзяржкамісію сарты з чырвонай і ружовай мякаццю.

СТАР. 9

З першых вуснаў

# «Нам вельмі важна захаваць усе дасягненні міжнароднага супрацоўніцтва»

**У Палацы Незалежнасці ўчора адбылася цырымонія ўручэння Прэзідэнту Беларусі даверчых грамат ад кіраўнікоў дыпламатычных місій сямі дзяржаў: Ватыкана, Венесуэлы, Ірана, Паўночнай Карэі, Сірыі, Турцыі і Японіі.**

Даверчыя граматы Аляксандру Лукашэнку ўручылі апостальскі нунцый у Беларусі Антэ Ёзіч, пасол Венесуэлы Франклін Рамірэс Араке, пасол Ірана Саід Яры, пасол КНДР Зу Зэн Бон, пасол Сірыі Махамад аль-Умрані, пасол Турцыі Мустафа Азджан, пасол Японіі Хірокі Такунага.



Фота БелТА.

## «Час перайсці да рэальных спраў»

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў удзельнікаў цырымоніі і адзначыў, што яны прыбылі ў Беларусь у гадавіну Вялікай Перамогі.

«75 гадоў таму народы Савецкага Саюза разам з заходнімі саюзнікамі знішчылі гітлераўскі нацызм і стварылі найважнейшы інструмент для раўнапраўнага міжнароднага ўзаемадзеяння — Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, — сказаў ён. — За высокі статус дзяржавы — заснавальніцы ААН Беларусь заплаціла неймаверную цану. На франтах Вялікай Айчыннай вайны, у баях з карнікамі, у канцлагерах і гета загінуў кожны трэці беларус».

Захоўваючы памяць пра незлічоныя ахвяры той вайны і разумеючы, чым сёння пагражае вялікі ваенны канфлікт, Беларусь паслядоўна выступае за аднаўленне шырокага дыялогу аб міры і міжнароднай бяспецы, падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што пачатак дыпламатычнай місіі новых паслоў у Беларусі прыйшоўся на вельмі складаны і адказны перыяд: другая хваля пандэміі COVID-19, пагаршэнне сусветнай эканамічнай кан'юнктуры, абвастрэнне міжнародных канфліктаў, з'яўленне пагроз у інфармацыйнай прасторы.

«Менавіта таму ***цяпер час дыктуе неабходнасць перайсці ад пустой рыторыкі і гучных палітычных дэкларацый да рэальных спраў, —*** лічыць кіраўнік дзяржавы. — ***Нам вельмі важна цвяроза ацаніць сітуацыю і захаваць усе дасягненні міжнароднага супрацоўніцтва».***

Ён выказаў упэўненасць, што толькі ўзгодненыя дзеянні ўсіх дзяржаў планеты, праяўленне гуманізму і салідарнасці, умацаванне атмасферы ўзаемнага даверу здольныя нейтралізаваць гэтыя пагрозы і стварыць трывалую аснову для вырашэння праблем.

«Беларусь — незалежная дзяржава з вялікім вытворчым, навуковым і чалавечым патэнцыялам, — заявіў ён. — ***Нягледзячы на ўсе цяжкасці, звязаныя з распаўсюджваннем каранавіруса, наша краіна застаецца адкрытая свету.*** Ніякія адлегласці і межы не могуць перашкодзіць развіццю даверлівых, узаемавыгадных адносін з нашымі партнёрамі».

Аляксандр Лукашэнка не сумняваецца, што кожны з замежных паслоў адкрые для сябе сваю Беларусь і ніколі не будзе расчараваны.

## «Мы здольныя не дапусціць грамадзянскага расколу»

Прэзідэнт спыніўся на тым, што зараз наша краіна перажывае няпросты перыяд, «звязаны з абаронай свайго суверэнітэту, захаваннем стабільнасці ўнутранай абстаноўкі і паглыбленнем грамадскага дыялогу».

«Калейдаскоп падзей 20-га года стаў выпрабаваннем не толькі для дзеючай улады, але і для ўсяго беларускага грамадства, — сказаў ён. — Як кіраўнік дзяржавы адказна заяўляю, што ***мы здольныя эфектыўна супрацьстаяць знешнім выклікам і пагрозам, забяспечыць унутрыпалітычную стабільнасць, не дапусціць грамадзянскага расколу і самавольства асобных радыкальных элементаў».***

Дзеянні ўлады адпавядаюць інтарэсам большасці грамадзян, «якія прагаласавалі за адзіную Беларусь і выступаюць за незалежную і ўстойлівую дзяржаву», дадаў Прэзідэнт. Ён не сумняваецца, што ***«беларусы валодаюць жаданнем, воляй і неабходным інструментарыем для аднаўлення стабільнасці ў грамадстве на падставе балансу інтарэсаў, захавання спакойнага і бяспечнага жыцця».***

«Мы гатовыя да ўзаемадзеяння з усімі нашымі замежнымі партнёрамі, абмеркавання любых пытанняў супрацоўніцтва, уключаючы абмен меркаваннямі пра сітуацыю ў Беларусі. Але толькі пры ўмове ўліку інтарэсаў бакоў і неўмяшання ва ўнутраныя справы», — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы традыцыйна прысвяціў некалькі слоў супрацоўніцтву з кожнай з дзяржаў, якія прадстаўляюць новыя паслы ў Беларусі.

## «Спадзяёмся на ролю каталіцкай царквы ў кансалідацыі грамадства»

«Асаблівыя адносіны звязваюць Беларусь і Ватыкан, — сказаў Прэзідэнт. — На міжнароднай арэне мы разам паслядоўна прасоўваем такія важныя ініцыятывы, як барацьба з гандлем людзьмі, супрацьдзеянне гвалту ў адносінах да дзяцей, абарона традыцыйных сямейных каштоўнасцяў».

Важнае месца ў двухбаковым парадку дня займаюць пытанні міжканфесійнага міру, дадаў беларускі лідар і выказаў спадзяванне на «канструктыўную ролю каталіцкай царквы ў кансалідацыі беларускага грамадства».

«Пацвярджаю нашу зацікаўленасць у далейшым паглыбленні ўзаемадзеяння са Святым Прастолам», — заявіў ён.

## «Важна, каб дамоўленасці з Анкарой не засталіся на паперы»

Турцыю Аляксандр Лукашэнка назваў важным саюзнікам Беларусі.

«Падчас майго візіту ў Анкару летась мы з Прэзідэнтам Эрдаганам намецілі шэраг крокаў, якія закліканыя ўмацаваць гандлёвыя і гуманітарныя сувязі, пашырыць кантакты паміж нашымі краінамі, — сказаў ён. — Мінск і Анкара адзіныя ў меркаванні, што плённы эканамічны дыялог — ключ да поспеху і прагрэсу. Таму важна, каб дасягнутыя намі дамоўленасці не засталіся на паперы, а ўжо ў найбліжэйшы час былі ўвасобленыя ў жыццё».

## «Вітаем прыпыненне шэрагу абмежаванняў у адносінах да Ірана»

Іран — адзін са значных эканамічных і палітычных партнёраў Беларусі на Блізкім Усходзе, адзначыў Прэзідэнт.

«У нас вялікі патэнцыял, які, бясспрэчна, раскрыты далёка не цалкам, — лічыць ён. — Мы вітаем прыпыненне шэрагу абмежаванняў у адносінах да Ірана з боку ААН. Спадзяёмся на наступныя канструктыўныя крокі, накіраваныя на стабілізацыю ваенна-палітычнай абстаноўкі на Блізкім Усходзе».

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў Ірану за падтрымку Беларусі на шматбаковых пляцоўках, паабяцаў адказваць узаемнасцю і выказаў гатоўнасць да працягу ўзаемадзеяння з гэтай краінай у міжнародных арганізацыях.

## Аднаўленне Сірыі будзе садзейнічаць двухбаковым адносінам

«Трывалыя сувязі, якія характарызуюцца высокім узроўнем даверу і шчырым сяброўствам, усталяваныя паміж Мінскам і Дамаскам, — працягнуў беларускі лідар. — Беларусь актыўна падтрымлівае суверэнітэт, тэрытарыяльную цэласнасць і выступае за неўмяшанне ва ўнутраныя справы Сірыі».

Намаганні сірыйскага кіраўніцтва, нацэленыя на хуткае ўрэгуляванне ўнутрыпалітычнай сітуацыі, аднаўленне эканомікі і сацыяльнай сферы, будуць садзейнічаць актывізацыі ўзаемадзеяння паміж дзвюма краінамі, выказаў упэўненасць Прэзідэнт.

## «І надалей акажам пасільную падтрымку Венесуэле»

«У Лацінскай Амерыцы ў нас напрацаваны значны вопыт двухбаковых адносін з Венесуэлай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы будзем і надалей аказваць вашай краіне пасільную падтрымку. Вельмі спадзяюся, што новы пасол будзе ўсяляк садзейнічаць актывізацыі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў гандлёвай і гуманітарнай сферах».

## «Неапраўдана нізкі ўзровень адносін Беларусі і КНДР»

Неапраўдана нізкім назваў Прэзідэнт узровень адносін Беларусі і Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі.

«Нам трэба больш актыўна працаваць у гэтым кірунку, — лічыць ён. — Мы ўважліва сочым за развіццём абстаноўкі на Карэйскім паўвостраве і падтрымліваем усе намаганні, якія прымаюцца па забеспячэнні міру і вырашэнні супярэчнасцяў у рэгіёне ў цэлым».

Аляксандр Лукашэнка выказаў зацікаўленасць працягваць канструктыўныя кантакты з КНДР у міжнародных арганізацыях і папрасіў новага кіраўніка дыпмісіі звярнуць увагу на такія сферы супрацоўніцтва, як вытворчасць лекаў, прадуктаў харчавання, прафесійнае навучанне і павышэнне кваліфікацыі кадраў.

## «З Японіяй ёсць значныя рэзервы ў гандлі, прамкааперацыі і інвеставанні»

«Узаемадзеянне з Японіяй мае значныя рэзервы — у гандлі, прамысловай кааперацыі, інвестыцыйным супрацоўніцтве ў галіне навукі, тэхналогій, — сказаў кіраўнік дзяржавы паслу з гэтай краіны. — Мы вельмі высока цэнім навуковую і гуманітарную дапамогу ў ліквідацыі наступстваў Чарнобыля. Са свайго боку гатовыя і далей дапамагаць вашай краіне пасля аварыі на Фукусіме і працягнуць аздараўленне японскіх дзяцей у Беларусі».

Будучая летняя Алімпіяда і Паралімпійскія гульні ў Токіа ў 2021 годзе станучь не толькі яркім святам спартыўных дасягненняў, але і будуць садзейнічаць яднанню народаў, упэўнены беларускі лідар.

## «Беларусь адкрытая для канструктыўных ініцыятыў»

Дзяржавы, паслы якія сёння ўручылі Прэзідэнту Беларусі даверчыя граматы, знаходзяцца на розных кантынентах, але іх аб'ядноўвае імкненне зрабіць свет больш бяспечным, эканоміку — больш устойлівай, а жыццё простых людзей — лепшым, сказаў у канцы афіцыйнай прамовы Аляксандр Лукашэнка.

***«Беларусь умее цаніць шчырасць, давер і заўсёды адкрытая для любых канструктыўных ініцыятыў, —*** дадаў ён. — Упэўнены, што вы не проста будзеце добразычлівымі назіральнікамі за працэсамі, якія адбываюцца, а акажаце ўсякае садзейнічанне фарміраванню раўнапраўных, узаемавыгадных адносін з нашай Беларуссю. У вашых сілах наблізіць і ўзаемна ўзбагаціць нашы культуры, дапамагчы пашырэнню гуманітарнага супрацоўніцтва і міжасобасных кантактаў».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ЁСЦЬ ЗРУХІ НА АФРЫКАНСКІМ РЫНКУ

**Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў з кіраўніком спраў Прэзідэнта Віктарам Шэйманам работу прадпрыемстваў Кіраўніцтва справамі і супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі.**

«Мяне цікавіць, як працуе Кіраўніцтва справамі з прадпрыемствамі сваімі, перш за ўсё, — абазначыў адну з тэм размовы Аляксандр Лукашэнка. — Лічы, адпрацавалі тры кварталы. Якая там сітуацыя і што найбольш насцярожвае? Людзей, вядома, нельга пакрыўдзіць. Бо адна справа — шыльда «Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта», і людзі розныя недахопы там звязваюць з работай Прэзідэнта».

У распараджэнні Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта знаходзяцца 118 прадпрыемстваў дзяржаўнай, сумеснай формы ўласнасці, а таксама якія адпавядаюць форме дзяржаўна-прыватнага партнёрства, удакладніў Віктар Шэйман. Калі дадаць тыя, што знаходзяцца ў працэсе стварэння, прычым блізка да яго завяршэння, будзе 126.

«Гэта цэлае міністэрства, — заўважыў Прэзідэнт. — Акрамя ўсяго таго, чым яшчэ прыходзіцца займацца, маю на ўвазе іншыя пытанні: забеспячэння дзяржаўных органаў і гэтак далей».

Другая тэма размовы Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніком спраў Прэзідэнта — выхад на афрыканскі рынак. Гэта таксама сфера адказнасці Віктара Шэймана ў апошнія гады.

«Бачу, што пайшлі зрухі па продажы тэхнікі, няхай не маштабныя, але тое, пра што мы дамаўляліся і што планавалі, ужо нейкі працэс пачаўся, — сказаў беларускі лідар. — Як ідуць справы? Што ўплывае негатыўна на развіццё адносін з афрыканскімі дзяржавамі? Але з імі трэба супрацоўнічаць. Гэта дзяржавы, як мы кажам, далёкай дугі. Дзяржавы багатыя на прыродныя рэсурсы. Можа, мы недзе нешта зможам для сябе здабываць, можа, у абмен на свае тавары неяк будзем працаваць. Ну і прадаваць праз афрыканскія банкі».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Дзеля памяці

# ЗМІТРОК БЯДУЛЯ. ВЯРТАННЕ НА РОДНУЮ ЗЯМЛЮ

## На 26-м участку Усходніх могілак у Мінску перапахавалі астанкі класіка беларускай літаратуры Змітрака БЯДУЛІ (1886—1941)

**Сімвалічна, што гэтая падзея адбылася ў дзень смерці пісьменніка — 3 лістапада. Як вядома, пахаваны Змітрок Бядуля быў ва Уральску (Казахстан). «Звязда» падрабязна расказвала гісторыю смерці і пахавання ў суботняй гутарцы з дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Міхаілам РЫБАКОВЫМ. Гэтая асветніцкая ўстанова шмат намаганняў прыклала для рэалізацыі праекта вяртання астанкаў пісьменніка ў Беларусі. Дадому, у родную старонку, яны былі прывезены 26 лютага 2020 года. А ўчора, перад тым як правесці цырымонію перапахавання на Усходніх могілках, з паэтам развіталіся і ў «Беларускай хатцы».**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Яфім Самуілавіч ПЛАЎНІК *(на першым плане)* кідае зямлю ў магілу бацькі.

А пасля ўсе родныя, блізкія Самуілу Плаўніку — Змітраку Бядулю, пісьменнікі, праваслаўныя святары, арганізатары пахавання сабраліся на магілках. Грамадзянскую паніхіду ўступнай прамовай адкрыў дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Міхаіл РЫБАКОЎ. Менавіта ён многае зрабіў дзеля вяртання астанкаў пісьменніка ў Беларусь, арганізацыі перапахавання ў Беларусі. Дзякуючы яго руплівасці і пры падтрымцы ўрада краіны, непасрэдна Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, справа была завершана самым дастойным чынам. Гэта падкрэсліў і сын літаратара — Яфім Самуілавіч ПЛАЎНІК, які да нядаўняга часу не зусім і верыў, што ўдасца прыйсці да станоўчага выніку. Міхаіл Рыбакоў у сваёй прамове нагадаў пра выключную работу, здзейсненую дабрачынным фондам Марыі Магдалены Радзівіл, які заснаваны ў Швейцарыі, і яго кіраўніком Аляксандрам САПЕГАМ. Сапраўды, арганізацыйна ды і матэрыяльна, фізічна зрабіць усё было даволі няпроста. Вырашэнню справы спрыялі і ўлады казахстанскага горада, акімат Уральска.

На цырымоніі перапахавання выступіў дырэктар Інстытута літаратуразнаўства Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук Іван САВЕРЧАНКА. Ён нагадаў пра тую вялікую работу па падрыхтоўцы і выданні збору твораў Змітрака Бядулі, якую выканаў навуковы інстытут некалькі дзесяцігоддзяў таму. Выдадзены немалым накладам, збор твораў і зараз даступны чытачам айчынных бібліятэк, ёсць у многіх прыватных кнігазборах. Іван Саверчанка нагадаў, што беларускія акадэмікі, народны пісьменнік Беларусі Іван НАВУМЕНКА і доктар філалагічных навук Віктар КАВАЛЕНКА спрыялі вывучэнню жыцця і творчасці Змітрака Бядулі, кожны з іх напісаў сваю кнігу пра класіка беларускай літаратуры. Сваімі цёплымі разважаннямі пра сціплую веліч таленту Змітрака Бядулі, яго асаблівую энергетыку, якая зачароўвае чытацкую свядомасць, падзялілася на Усходніх могілках першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ. Выступіў на грамадзянскай паніхідзе і дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ. Ён, у прыватнасці, падкрэсліў, што айчынныя дзяржаўныя выдавецтвы з цікавасцю ставяцца да перавыдання твораў класіка. Але, несумненна, творчая спадчына і надалей патрабуе пераасэнсавання, яшчэ больш патрабуе ўважлівага разгляду. І «Сярэбраная табакерка», і «Салавей», і «Пяць лыжак заціркі» — неўміручыя творы, якія з'яўляюцца адлюстраваннем часу, адбіткам яго сацыяльных, палітычных, грамадскіх адметнасцяў. Змітрок Бядуля ўсведамляў мінуўшчыну, пільна ўглядаўся ў блізкія да яго падзеі, зазіраў праз асэнсаванне іх у заўтрашні дзень. Ці не таму ён па-ранейшаму такі сучасны — празаік, казачнік Бядуля?! А яшчэ ж ён быў этнографам, публіцыстам, краязнаўцам... І пра гэта таксама сёння не варта забывацца.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

Энергетыка

# ПАЧАТАК АТАМНАЙ ЭРЫ

## АЭС выдала першыя «атамныя» кілават-гадзіны ў энергасістэму краіны

**Турбагенератар першага энергаблока атамнай станцыі 3 лістапада ў 12.03 уключылі ў адзіную энергасістэму Беларусі. Пасля сінхранізацыі з сеткай краіны станцыя выпрацавала першыя кілават-гадзіны электраэнергіі, якія адправіліся ў аб'яднаную сістэму, паведаміла прэс-служба дзяржкарпарацыі «Расатам».**

*— Паступленне першых «атамных» кілават-гадзін электраэнергіі ў адзіную энергасістэму Беларусі — гістарычная з'ява, якая знамянуе пачатак атамнай эры. Гэта стала магчыма дзякуючы доўгай і прадуктыўнай рабоце беларускіх і расійскіх спецыялістаў,* — заўважыў **Аляксей ЛІХАЧОЎ, генеральны дырэктар дзяржкарпарацыі «Расатам».** *— Да ўводу блока ў прамысловую эксплуатацыю давядзецца выканаць яшчэ шмат работы, аднак ужо сёння можна казаць пра поспех праекта Беларускай АЭС, першай атамнай станцыі пакалення III+, якая створана па расійскіх тэхналогіях за межамі Расіі.*

Нагадаем, што ўвод першага энергаблока ў прамысловую эксплуатацыю запланаваны на I квартал 2021-га. 23 кастрычніка Беларуская АЭС і інжынірынгавы дывізіён дзяржкарпарацыі «Расатам» атрымалі ад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дазвол на выкананне работ па этапе энергетычнага пуску, якім прадугледжаны пад'ём магутнасці рэактарнай установкі да 50 % ад намінальнай, уключэнне энергаблока ў адзіную энергасістэму краіны і правядзенне дынамічных выпрабаванняў на ўзроўні магутнасці рэактарнай установкі 50 %. 30 кастрычніка на першым энергаблоку выканалі пробны пуск турбіны, так званы першы штуршок турбіны на магутнасці рэактара 35 %. Турбіну пракруцілі на халастой хадзе і паэтапна павялічылі колькасць абаротаў да праектных трох тысяч абаротаў за хвіліну. Гэтая працэдура фактычна абумовіла пачатак выпрацоўкі электраэнергіі.

*— Праект АЭС-2006, на падставе якога стваралася Беларуская АЭС, — адзін з самых перспектыўных і запатрабаваных на міжнародным атамным рынку. Сёння асноўнымі заказчыкамі атамных станцый з энергаблокамі пакалення III+ з рэактарамі ВВЭР-1200 сталі Фінляндыя, Венгрыя, Турцыя, Бангладэш, Кітай і іншыя краіны,* — падкрэсліў **Андрэй ПЯТРОЎ, генеральны дырэктар арганізацыі «Канцэрн Расэнергаатам».**

У праекце Беларускай АЭС рэалізаваны поўны комплекс тэхнічных рашэнняў, якія дазваляюць забяспечыць бяспеку работы энергаблока і выключыць выхад радыеактыўных прадуктаў у навакольле нават пры поўнай страце энергазабеспячэння, падкрэсліваюць спецыялісты.

**Ірына СІДАРОК.**

# Суткі ў лесе з сабакам

**У 10 гадзін у Чачэрскі РАУС звярнуўся мясцовы жыхар. Ён паведаміў, што раніцай разам з сужыцелькай і сабакам пайшоў у лес у грыбы каля вёскі Балсуны. Там грыбнікі разышліся. Спачатку яны бачылі адно аднаго, але потым жанчына і сабака зніклі з вачэй. Спробы дакрычацца не дапамаглі. Сітуацыя ўскладнялася тым, што зніклая не ведала гэты лес, а яе тэлефон застаўся дома.**

Пошукі 49-гадовай жанчыны працягваліся да трох гадзін ночы. На досвітку новая група адправілася прачэсваць лясны масіў. Дапамогу міліцыянерам аказвалі работнікі МНС і ляснічыя.

Апоўдні міліцыянеры рухаліся на машыне па дарозе, якая вядзе да адселенай вёскі Палам, што ў васьмі кіламетрах ад месца пачатку пошукаў. Сярод дрэў заўважылі постаць чалавека. Аказалася, што гэта зніклая без вестак. Побач з ёй быў сабака.

Высветлілася, што ўсю ноч жанчына і жывёла правялі пад ялінай, а калі развіднела, пайшлі шукаць выхад з лесу. Як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, скаргаў на здароўе ад знойдзенай не паступіла, па медыцынскую дапамогу яна не звярталася.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Аўстрыі аб'яўлена трохдзённая жалоба па загінулых падчас тэракта ў Вене



Аўстрыйскія ўлады вырашылі абвясціць трохдзённую жалобу ў краіне з-за тэракта ў Вене, паведаміла нямецкая газета Tagesspiegel. Такое рашэнне было прынята на надзвычайным пасяджэнні кабінета міністраў Аўстрыі. У панядзелак увечары тэрарысты арганізавалі напад на шасці розных адрасах. На вуліцах было шматлюдна, паколькі гэта быў апошні вечар перад увядзеннем новага каранціну з-за распаўсюджвання каранавіруса. Канцлер Себасцьян Курц у эфіры тэлеканала ORF пацвердзіў, што паліцыя расцэньвае тое, што адбылося, як тэракт. Паводле асобных крыніц, загінулі па меншай меры чатыры чалавекі. Забіты і адзін з тэрарыстаў, які, па словах кіраўніка МУС Аўстрыі Карла Нехамера, быў ісламістам. Раненні атрымалі 17 чалавек.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Федэральнаму Прэзідэнту Аўстрыйскай Рэспублікі Аляксандру Ван дэр Белену ў сувязі з расстрэлам мірных грамадзян у цэнтры Вены. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы. «Рашуча асуджаем любыя праявы тэрарызму і нецярпімасці. Заклікаем сусветную супольнасць да ажыццяўлення своечасовых салідарных крокаў па дээскалацыі напружанасці і ўмацаванні міжканфесійнага міру і згоды», — адзначаецца ў спачуванні.

## У СААЗ заявілі пра наступленне крытычнага этапу пандэміі




Наступныя некалькі месяцаў сітуацыя будзе цяжкая, заявіла ТАСС прадстаўнік СААЗ у Расіі Меліта Вуйнавіч. «У глабальным зрэзе мы знаходзімся на крытычным этапе пандэміі, асабліва ў паўночным паўшар'і», — заявіла яна. Вуйнавіч адзначыла, што ў некаторых краінах становішча ўжо сёння вельмі сур'ёзнае і захворванне працягвае пашырацца. Па стане на 3 лістапада ва ўсім свеце зарэгістравана каля 47 мільёнаў выпадкаў захворвання і 1,2 мільёна смерцяў сярод хворых на COVID-19. Вуйнавіч лічыць, што сёння працягваецца першая хваля, паколькі летам назіралася зніжэнне захваральнасці па натуральных прычынах, «але вірус нікуды не сышоў, ён застаецца ў папуляцыі». Эксперт упэўнена, што пандэмія будзе доўгім выклікам для свету. Паводле яе слоў, кіраўніцтва СААЗ заклікае ўсе краіны прымаць належныя меры для прадухілення новых смерцяў, абараняць магутнасці сістэм аховы здароўя, каб забяспечыць дапамогу як пры COVID-19, так і пры іншых захворваннях, скарачаць закрыццё школ, наколькі гэта магчыма.

## Дзеючага прэзідэнта Кот-д'Івуара пераабралі на чарговы тэрмін



Аласан Уатара перамог на выбарах кіраўніка дзяржавы і перавыбраны на чарговы тэрмін. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на Незалежную выбарчую камісію Кот-д'Івуара. «Аласан Уатара атрымаў 94,27 % галасоў выбаршчыкаў», — заявіў афіцыйны прадстаўнік выбаркама Эміль Эбрацье. Цяперашняя перамога Уатары на выбарах кіраўніка дзяржавы з'яўляецца трэцяй па ліку. Тэрмін паўнамоцтваў прэзідэнта складае пяць гадоў. У выбарах удзельнічалі яшчэ тры кандыдаты. Другую пазіцыю заняў незалежны палітык Куадзіё Конан Берцін з 1,99 % галасоў, за колішняга прэзідэнта краіны Анры Конана Бедзье прагаласавалі 1,66 % выбаршчыкаў, за былога прэм'ер-міністра Паскаля Афі Н'Гесона — 0,99 %. У Незалежнай выбарчай камісіі ёсць тры дні для перадачы вынікаў выбараў у Канстытуцыйны суд. Апошні на працягу сямі дзён павінен зацвердзіць іх.

Іван КУБРАКОЎ:

# «Работа, якая вялася да гэтага, працягнецца»


Фота МУС.

«Прэзідэнтам была пастаўлена задача па забеспячэнні бяспекі нашых грамадзян з улікам апэратыўнай абстаноўкі, якая складваецца, — пракаментаваў журналістам рашэнне кіраўніка дзяржавы новапрызначаны міністр унутраных спраў. По яго словах, асноўная ўвага была звернута на парадак у Мінску. Таксама была пастаўлена задача па ўмацаванні кадравага патэнцыялу Міністэрства ўнутраных спраў.

На пытанне прадстаўнікоў СМІ, ці варта чакаць кардынальных змен у рабоце ведамства, Іван Кубракоў адказаў, што «работа, якая вялася да гэтага, працягнецца».

«Будзе створаны калектыў, бо вельмі шмат супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў прызначаны на іншыя пасады, пайшлі на павышэнне. Таму будзем ствараць каманду і будзем сумесна працаваць», — дадаў ён.

З нагоды

# ЗАЎЖДЫ НА БАЯВЫМ ДЗЯЖУРСТВЕ

## Прайшло 68 гадоў з даты ўтварэння падраздзяленняў Дэпартамента аховы

**Вядомая песенька з мультфільма «Брэменскія музыканты» «Ох, рана ўстае ахова» крыху скажае рэчаіснасць. Ахова наогул не спіць ніколі. Праўда, на побытавым узроўні мы рэдка пра гэта задумваемся. Сыходзячы з дому, чыста механічным рухам дакрануліся ключом-таблеткай да спецыяльнай прылады, праверылі, каб загарэўся чырвоны святлодыёд — і пайшлі далей па сваіх справах. Але хто ж менавіта ахоўвае нашы кватэры, прыватныя дамы, крамы і безліч устаноў? Пра гэта — начальнік Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў, палкоўнік міліцыі Аляксандр ШЭПЕЛЕЎ.**

***— Як шмат кватэр і дамоў сёння знаходзіцца пад абаронай Дэпартамента аховы? У якім кірунку змяняецца іх колькасць з цягам часу?***

— Наша асноўная задача — ахова маёмасці незалежна ад яе формы ўласнасці. Зараз нам даручана ахоўваць больш за 165 тысяч кватэр і прыкладна 85 тысяч іншых аб'ектаў. На першы погляд гэта шмат, але ад агульнай колькасці жылога фонду мы абараняем усяго 7 %. Штомесяц манціруем да паўтысячы новых сістэм. Прычым тэмпы прыкметна выраслі — раней гэтая лічба рэдка перавышала адзнаку ў дзвесце штук. Таму, як бачым, нам ёсць куды імкнуцца. У першую чаргу — праз тое, што заканчваецца мадэрнізацыя сістэмы сувязі. Як вядома, ад медных правадоў краіна паступова пераходзіць на оптавалакно. А калі кватэра ахоўваецца менавіта такім спосабам, то яе ўладальніку давядзецца за свой кошт замяніць ахоўнае абсталяванне. Пры гэтым мы гатовы прапанаваць беспрацэнтную растэрміноўку, але на такія ўмовы пагадзіліся не ўсе. Таму колькасць скасавання дамоў спачатку вырасла, але нязначна.

Больш за тое, памер штомесячнай абаненцкай платы, які складае дзевяць з паловай рублёў, у агляднай перспектыве павялічвацца не будзе. Па сутнасці, гэта ўжо сацыяльная паслуга. І такой яна застанецца і надалей.



***— Але ж пераход на новыя стандарты сувязі даў і пэўныя плюсы?***

— На першы погляд чалавеку збоку можа здавацца, што Дэпартаменту аховы няма куды развівацца. Адны і тыя ж функцыі застаюцца дзесяцігоддзямі. Але гэта не так. Насамрэч, адышоўшы ад медных ліній правадоў, мы выраслі тэхналагічна. Напрыклад, для перадачы даных ад аб'ектаў і жылых памяшканняў да падраздзяленняў Дэпартамента аховы выкарыстоўваюцца оптавалаконныя і GSM-каналы сувязі. Гэтыя спосабы перадачы даных менш падвяргаюцца ўплыву навакольнага асяроддзя.

— Самі карыстальнікі нашых паслуг заўважылі, што цяпер пры здачы пад ахову не трэба чакаць падключэння прыкладна паўхвіліны — зараз яно адбываецца воімгненна. Нашы новыя прыборы могуць працаваць адначасова па дзвюх лініях сувязі — як сотавай, так і правадной. І калі па нейкіх прычынах сувязь па адным канале становіцца няўстойлівая, то прыбор аўтаматычна пераключаецца на рэзервовы.

Зараз мы ўдзяляем увагу распрацоўцы новай лінейкі прыбораў. Яны будуць запатрабаваны ў маналітных дамах. Нярэдка іх канструкцыі спрацоўваюць як своеасаблівы бункер, праз што перадача даных па каналах мабільнай сувязі можа быць не вельмі ўстойлівая. Эксперыментальныя мадэлі паказалі, што гэтую праблему можна вырашыць.

***— Колькі сёлета было спроб пранікнення ў памяшканні, якія знаходзяцца пад аховай?***

— Сёлета нядобрасумленныя грамадзяне спрабавалі зрабіць гэта 83 разы. І ва ўсіх выпадках мы спынілі супрацьпраўныя дзеянні, не дапусціўшы ніводнага крадзяжу і своечасова затрымаўшы зламыснікаў. Было заведзена 45 крымінальных спраў. Калі параўноўваць абстаноўку з мінулым годам, то ідзе павелічэнне такіх выпадкаў, асабліва ў апошнія два месяцы. Але спакушацца на чужое бессэнсоўна — мы своечасова прыедзем на любы выклік.

***— Наколькі распаўсюджаны трывожныя кнопкі?***

— Гэта самая запатрабаваная форма аховы — як у жылых дамах, так і ў юрыдычных асоб. Дастаткова сказаць, што толькі сярод кватэр гэтую форму аховы абрала больш за 62 тысячы. З году ў год іх колькасць расце на дзве-тры тысячы. Але чым жа яны прываблiваюць людзей?

Па-першае, яе падключэнне вельмі таннае — усяго чатыры з паловай рублі, пры ўмове наяўнасці раней устаноўленых сродкаў ахоўнай сігналізацыі ў жылым памяшканні. У выпадку набыцця бірулькі пераноснай радыёкнопкі трывожнай сігналізацыі радыус яе дзеяння вагаецца ад 150 метраў да паўтара кіламетра ў залежнасці ад тэхнічных характарыстык і месца, дзе манціруецца абсталяванне. Вялікай папулярнасцю трывожныя кнопкі карыстаюцца ў аб'ектаў гандлю, асабліва дзе гандлююць алкаголем або дарагімі рэчамі. Там у выпадку няштатнай сітуацыі патрабуецца кароткатэрміновае прыбыццё нарада.

***— Як пераўзбройваецца аўтамабільны парк Дэпартамента аховы?***

— Гэта наша неад'емная частка, паколькі тое, што чакаюць людзі, якія даверылі нам ахову сваёй маёмасці, — гэта максімальна хуткае прыбыццё ў выпадку неабходнасці і затрыманне злачынцы. Так, сёлета мы ўжо замовілі 131 аўтамабіль айчыннай вытворчасці. Але ад тых, якімі карысталіся раней, яны прыкметна адрозніваюцца. У новых машынах будуць устаноўлены аўтаматызаваныя рабочыя месцы групы затрымання. У рэжыме рэальнага часу сігнал трывогі паступіць непасрэдна экіпажу аховы з пабудовай маршруту руху да аб'екта, што дасць магчымасць значна скараціць час рэагавання.

***— Як часта даводзіцца задзейнічаць службовых сабак?***

— Насамрэч на нашых кінолагаў кладзецца велізарная работа. Кінолаг заўсёды ў складзе следча-аператыўнай групы выязджае на месца злачынства. Пры неабходнасці ён можа задзейнічаць службовага сабаку. Перад закрыццём гандлёвага цэнтра туды абавязкова прыйдзе кінолаг з сабакам, які прасочыць за тым, каб ніхто не застаўся ў памяшканні на ноч. Найбольш адметна тое, што менш за ўсё мы выкарыстоўваем нашых чатырохлапых памочнікаў на затрыманні зладзеяў. Гэта насамрэч крайняя мера, як і выкарыстанне зброі. Наступствы могуць быць сур'ёзныя — пракусы, пераломы. Але, на жаль, калі іншых варыянтаў спыніць злодзея няма — то сабака будзе на яго спушчаны. У сваю чаргу, для нас важна, каб кінолаг і сабака ўяўлялі сабой адзіны разлік. І адбракоўка ідзе вельмі сур'ёзная. Напрыклад, у нашым вучэбным цэнтры, што знаходзіцца пад Мінскам, кінолаг чатыры месяцы амаль безадрыўна вучыць маладое шчаня паслухмянасці, выкананню пэўных каманд і затрыманню. Толькі тады, калі экзамен будзе здадзены паспяхова, разлік зможа разам несці службу.

Дарэчы, мы ўкараняем новую тактыку дзеянняў групы затрымання. У кожнай з іх будзе тэлескапічная лесвіца, якая ад аднаго ўзмаху раскладваецца на пяць з паловай метраў. Пры яе дапамозе можна хутчэй агледзець дахі дамоў, гаражоў. Такая лесвіца дазволіць лягчэй пераадольваць платы з металапрофілю. Тэхнічнае пераўзбраенне закране і радыё — аналагавыя рацыі зменяцца лічбавымі. Гэта неабходна для большай абароненасці эфіру.

***— Каб трапіць на службу ў Дэпартамент аховы, якімі якасцямі мусіць валодаць саіскальнік?***

— У нас працуе сістэма вельмі жорсткага адбору. І так павінна быць, бо мы мусім вызначыць, хто прыдатны да службы, а хто не. Па-першае, патрэбны выдатныя фізічныя якасці. Першая або другая група здароўя — гэта абавязковая ўмова. Тут можна прывесці адзін цікавы прыклад. У лістападзе мае адбыцца чэмпіянат Еўропы па самба, у якім будуць удзельнічаць дзесяць нашых супрацоўнікаў. Усе яны нясуць службу як звычайныя міліцыянеры, і толькі ў вольны ад службы час займаюцца спортам. Немалаважны кампанент — псіхалагічная ўстойлівасць. У ліку першых на месца здарэння прыбывае менавіта наш супрацоўнік. А з чым ён сутыкнецца на месцы падзей, невядома. Таму быў арганізаваны цэлы комплекс вывучэння патэнцыяльных кандыдатаў. І з кожнай сотні кандыдатаў такую сістэму адбору праходзяць усяго пяць—дзесяць чалавек.

***— У завяршэнне гутаркі давайце вернемся да звычайнага побыту. Скажам, чалавек забыўся адключыць сігналізацыю і ўвайшоў у кватэру. Што яму за гэта будзе?***

— Мы адышлі ад практыкі штрафных санкцый у такім разе. Хутчэй успрымаем гэта як дадатковую трэніроўку. Наш абанент атрымае паведамленне, каб ён памятаў пра правільны парадак дзеянняў, — спачатку адключыць сігналізацыю, а толькі пасля ўваходзіць. Але калі такія сітуацыі паўтараюцца на адным і тым жа аб'екце сістэматычна, то менавіта так, штраф у такім выпадку будзе прызначаны. Праўда, у нашай практыцы гэта адбываецца вельмі рэдка. У асноўным людзі, якія даверылі нам ахову свайго жылля, разумеюць сваю адказнасць.

На слыху

# СУЧАСНЫ ПАШПАРТ. УЖО НАЛЕТА

**Вось ужо каля дзясятка гадоў не траціць актуальнасці ў Беларусі тэма ўвядзення біяметрычных пашпартоў і ідэнтыфікацыйных картак. Праўда, з розных прычын тэрмін, пасля якога меркавалася перастаць выдаваць класічныя пашпарты-«кніжкі», пераносіўся. Яно і недзіўна — трэба было сабраць проста велізарнейшы масіў даных, а таксама адпрацаваць усе юрыдычныя тонкасці ў заканадаўстве.**

**Што ж ужо ў наступным годзе зменіцца для кожнага з нас? Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказаў намеснік начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Павел ХРЫШЧАНОВІЧ.**



— Цяпер большасць развітых краін свету ўжо перайшла на выкарыстанне біяметрычных даных у пасведчаннях асобы. Цікава, што ўсе дзяржавы постсавецкай прасторы таксама далучыліся да гэтага спіса. Выключэннем застаецца толькі Беларусь.

Пры гэтым першы раз пытанне пераходу на «біяметрыю» было ўзнята яшчэ ў 2010 годзе. У той час такія пашпарты актыўна ўкараняліся ў краінах Паўночнай Амерыкі, Еўрасаюза і Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна. А вось у нас гэтую задуму адклалі — галоўным чынам праз недахоп фінансаў. Час ішоў, на новыя ўзоры дакументаў пераходзіла ўсё больш краін. І вось чатыры гады таму ў Беларусі быў зацверджаны комплекс мер па ўкараненні біяметрычных дакументаў. А таксама планавалася стварыць Беларускую інтэграваную сэрвісна-разліковую сістэму. Да сумеснага праекта падключылася шмат ведамстваў. У іх ліку — міністэрствы сувязі і інфарматызацыі, унутраных спраў і фінансаў.

— Работа спярша раздзялілася на дзве часткі. Міністэрства ўнутраных спраў адказвала за ўвядзенне ў эксплуатацыю біяметрычных дакументаў, а Мінсувязі — за стварэнне Беларускай інтэграванай сэрвісна-разліковай сістэмы. Меркавалася, што кожны грамадзянін атрымаў бы БЭК — «Беларускую электронную картку». Яны дапамагла б атрымліваць паслугі пры дапамозе інтэрнэту. Але нарадзілася ідэя: чаму б не аб'яднаць гэтыя два праекты? Тым больш што па задуме яны блізкія. Распрацаваць і надрукаваць бланкі і нарыхтоўкі нескладана. Куды складаней «падключыць» іх да адзінай базы даных.

Цяпер у Беларусі ўжо распрацаваны праект Указа «Аб увядзенні біяметрычных дакументаў». Ён заклікаены скарэктаваць Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2008 года № 294 «Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь» і палажэнне, якое было гэтым указам зацверджана.

Такім чынам, пасведчанне асобы, якое зараз прадстаўлена ў выглядзе аднаго пашпарта, будзе падзелена на два дакументы. Задача ідэнтыфікацыйнай карткі — пацвярджаць асобу яе трымальніка. А адмысловы біяметрычны пашпарт будзе выдавацца для выезду за мяжу. Ён будзе нагадваць існуючую цяпер «кніжку», якая ёсць у кожнага з нас. Калі ж у іншую краіну неабходна выехаць непаўналетняму, то ўсе дакументы для гэтага можна будзе афарміць па заяве аднаго з яго законных прадстаўнікоў.

Як і цяпер, выдаваць новыя дакументы будуць з 14 гадоў. У ID-картцы на чыпе будуць запісаны ўсе персанальныя даныя яе трымальніка. Алгарытм будзе наступны. Скажам, у вас хутка сконьчыцца тэрмін дзеяння пашпарта. Вы прыходзіце ў тэрытарыяльны аддзел па грамадзянстве і міграцыі, прад'яўляеце дакумент, які ёсць пры вас, пазначаеце ўсе неабходныя звесткі. Фотаздымак і адбіткі пальцаў, якія неабходна здаць, правераць па спецыяльным біяметрычным рэгістры на



супадзенне. Пакет даных зашыфруюць і адправяць па каналах сувязі ў спецыялізаваны цэнтр персаналізацыі. Ён будзе для краіны адзіны. У ім на спецыяльных машынах і стануць друкавацца дакументы. Для ID-карткі мяркуецца таксама генераваць адмысловы PIN-код. Пры яго дапамозе можна будзе карыстацца дзяржаўнымі электроннымі рэсурсамі, банкаўскімі паслугамі, фінансавымі сэрвісамі.

Таксама на ID-картцы змесцяць QR-код. Гэты сродак абароны будзе ўтрымліваць не так шмат інфармацыі — прозвішча, імя, імя па бацьку, нумар, тэрмін дзеяння, а таксама звесткі пра орган, які яе выдаў. А вось месца рэгістрацыі з новых дакументаў знікне.

Калі цяпер дастаткова паставіць штамп аб новай рэгістрацыі і заплаціць за гэта пошліну ў палову базавай велічыні, то, калі б мы захавалі звесткі аб рэгістрацыі на картцы, яе даваялося б мяняць. А гэта ўсё-такі дарагавата. Напрыклад, за выдачу новай ID-карткі даросламу давядзецца заплаціць 1,5 базавай велічыні. Біяметрычны пашпарт будзе каштаваць ужо дзве базавыя. Для пенсіянераў і інвалідаў зніжка складзе палову базавай велічыні. Дзецям жа, маладзейшым за 14 гадоў, ID-картку выдадуць бясплатна, а за біяметрычны пашпарт трэба будзе заплаціць паўтары базавай.




Таму схема таго, як жа даведацца месца вашай рэгістрацыі, цяпер будзе працаваць наступным чынам. Скажам, вы прыйшлі ў паліклініку. Пасля таго як вы прыклалі картку, сістэма заходзіць у электронную базу даных Міністэрства ўнутраных спраў. На маніторы высвечваюцца ўсе неабходныя звесткі. Паклапаціліся мы і пра бяспеку — як толькі вы картку прыбераце, уся інфармацыя знікне. Такім чынам, калі вы згубіце ID-картку, то староні чалавек, які яе знойдзе, не зможа даведацца ваша месцажыхарства.

Класічныя папяровыя пашпарты будуць выдавацца яшчэ два месяцы. Аднак часам здараецца, што новы дакумент трэба атрымаць датэрмінова. Прычына можа быць самая трывіяльная — напрыклад, пашпарт дзесьці згубіўся.

У такім выпадку вы атрымаеце толькі ID-картку. Справа ў тым, што цяпер персаналізацыя звычайных пашпартоў адбываецца ў Бюро пашпартызацыі МУС — як у Мінску, так і ва ўсіх абласных цэнтрах. І як толькі запрацуюць біяметрычныя тэхналогіі, усе гэтыя цэнтры будуць зачынены, і фізічна аддрукаваць цяперашні пашпарт проста не будзе дзе. Але трэба мець на ўвазе тое, што цалкам з ужытку цяперашняя «кніжачка» не выйдзе яшчэ вельмі доўга. Справа ў тым, што дзеючыя пашпарты захоўваюць тэрмін свайго дзеяння. А тым людзям, якім больш за 64 гады, выкарыстоўваць існуючыя дакументы можна будзе ажно да ста гадоў. Пры гэтым мы мяркуем, што налета будзе выдадзена прыкладна 800 тысяч ID-картак і каля 300 тысяч біяметрычных пашпартоў. Апошняя лічба зменшылася ў параўнанні з папярэднім прагнозам прыкладна ў два разы — цяпер праз сітуацыю з каранавірусам вандроўкі па свеце моцна ўскладнены. Рабіць прагнозы на далейшыя гады пакуль зачасна.

Што да біяметрычнага пашпарта, то ён прыкметна зменіцца ў параўнанні з цяперашнім пасведчаннем асобы. Старонка з персанальнымі данымі будзе ўжо полікарбанатнай, а чып уманцыруюць проста ў яе. Папера, дзе будуць прастаўляцца візы, таксама стала больш абароненай. А новая сістэма прашыўкі не дазволіць ускрыць пашпарт без бачных пашкоджанняў. Тут за ўзор былі ўзяты пашпарты, якія выкарыстоўваюцца ў краінах Еўрасаюза.

Мяркуецца, што новыя дакументы можна будзе атрымаць за пятнаццаць дзён. Але МУС прадугледзела і больш хуткія варыянты. Напрыклад, у паскораным фармаце ID-картку і біяметрычны пашпарт выдадуць за 5 дзён, а ў тэрміновым — за 10. Праўда, за больш сціслыя тэрміны давядзецца крыху даплаціць.

Старонка персанальных даных будзе змяшчаць мінімум інфармацыі: напісаныя лацінкай прозвішча і імя, дату нараджэння, орган, які выдаў дакумент, тэрмін дзейнасці і ідэнтыфікацыйны нумар. Усе гэтыя звесткі былі ўзгоднены з Дзяржаўным пагранічным камітэтам. Плюс на чып «зашыюць» адбіткі пальцаў і фотаздымак трымальніка ў высокай якасці. І больш за тое, біяметрычны пашпарт будзе развівацца і надалей. Наступным крокам стануць біяметрычныя візы. Праўда, гэта справа пакуль што няблізкай будучыні.

**— А калі чалавек па нейкіх сваіх перакананнях не захоча атрымліваць ID-картку?**

— У краіне каля 800 чалавек, якія не атрымалі дзеючыя цяпер пашпарты. Але ёсць закон, і ён для ўсіх адзіны. Мы кансультаваліся з прадстаўнікамі ўсіх рэлігійных канфесій у Беларусі. Ніводны з іх не выказаў наконт ідэнтыфікацыйнага нумара ці біяметрыі чагосьці супраць.

Павел Хрышчановіч прыгадвае і прапановы, якія паступалі падчас абмеркавання таго, якой павінна быць беларуская ID-картка. Агучваліся самыя неверагодныя варыянты — сумясціць яе з правамі кіроўцы, пасведчаннем паляўнічага і нават з банкаўскай карткай.

— Зручнасць тут насамрэч уяўная. Можа ж стацца так, што банкамат «праглыне» картку. І вы застанецеся без пасведчання асобы, — адзначае суразмоўнік. — А калі гэта здарылася за мяжой, што тады рабіць? Правы кіроўцы таксама могуць быць адабраныя, напрыклад, за ваджэнне ў нецвярозым стане. Усё гэта дадало б столькі непатрэбнай валтузні, што і было прынята рашэнне не сумяшчаць ID-картку з іншымі дакументамі. Пашпарт мусіць застацца пашпартам, хай сабе і ў «пластыкавай» форме.

**Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.



# «ПРАВЕРЦЕ ЯШЧЭ РАЗ УСЁ»

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытаннях процідзеяння распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі, піша БелТА.**

У мерапрыемстве, якое прайшло ў рэжыме відэа-канферэнц-сувязі, прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя, устаноў аховы здароўя абласцей і горада Мінска. Адбылася грунтоўная і дэталёвая размова аб бягучай сітуацыі з захваральнасцю на COVID-19, функцыянаванні лячэбных устаноў у перыяд пандэміі, выстройванні стратэгіі далейшай работы, у тым ліку з насельніцтвам.

Наталля Качанава асаблівую ўвагу звярнула на перапрафіляванне ложкавага фонду і выкарыстанне кіслародных пунктаў. «Я б хацела звярнуць увагу на бяспечнае захоўванне і выкарыстанне кіслароду, выкананне правілаў тэхнікі бяспекі. Абавязкова праверце яшчэ раз усё. Падключыце ўсе свае службы, — адзначыла яна. — Другі важны момант — перапрафіляванне ложкавага фонду, калі гэта неабходна. Яшчэ вясной мы распрацавалі планы работы пры адначасовым паступленні пэўнай колькасці пацыентаў. Адзінае, сёння я хацела б пачуць ад вас пра сітуацыю з наяўнасцю свабодных месцаў ва ўстановах аховы здароўя. Акрамя таго, неабходна звярнуць увагу на ўстановы, якія займаюцца далечваннем і рэабілітацыяй пацыентаў, якія перанеслі каранавірусную інфекцыю. Я б таксама хацела гэта пачуць ад кіраўнікоў камітэтаў аховы здароўя абласцей».

Аб бягучай сітуацыі і гатоўнасці да работы ў перыяд другой хвалі COVID-19 расказаў **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК.** «Першае, намі распрацаваны выразны план перапрафілявання ложкавага фонду пад COVID-19 у адпаведнасці з эпідсітуацыяй. Другое, дакладны разлік сіл і сродкаў арганізацый аховы здароўя. Звяртаю асаблівую ўвагу: наш «Тэхнацэнтр» ужо паставіў больш за 300 разгалінавальнікаў, якія можна выкарыстоўваць у любым аддзяленні, бальніцы, палаце. Разгалінавальнікі можна выкарыстоўваць адначасова на 4 і 6 пацыентаў, што дасць магчымасць выключыць недахоп кіслародных пунктаў», — дадаў ён.

# COVID-19, ГРЫП І ІНШЫЯ ВРВІ

## Як засцерагчыся ў сезон пад'ёму захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі?

**У цяперашні час назіраецца павышэнне захваральнасці на ВРВІ. Ва ўсім свеце працягвае цыркуляваць COVID-19, рост колькасці новых выпадкаў ёсць і ў нашай краіне. Разам з тым захваральнасць на ВРВІ пакуль знаходзіцца на неэпідэмічным узроўні. Спецыялісты расказалі, як вядзецца вакцынацыя ад грыпу і чаму ў гэтым сезоне вялікі попыт на прышчэпкі, як абараніць сябе ад ВРВІ і каранавіруса, якія прадукты ўмацоўваюць імунітэт і чым рацыён здаровага чалавека адрозніваецца ад рацыёна таго, хто хварэе, ці ёсць розніца, якую маску насіць, і ці трэба прымаць супрацьвірусныя прэпараты.**

— Цяпер мы адзначаем рост вострых рэспіраторных інфекцый, як і звычайна ў гэты час. Асноўную долю сярод захварэлых складаюць дзеці — 54 %, — адзначае **начальнік аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.** — Ад грыпу вакцыянавана 35,3 % насельніцтва. Сёлета мы назіраем дастаткова інтэнсіўныя тэмпы вакцынацыі — многія імкнуцца прышчапіцца як мага хутчэй. Вялікі попыт на платныя вакцыны, яны хутка скончыліся, нягледзячы на тое што былі завезеныя ў павялічаных аб'ёмах.

Спецыяліст расказала, што найперш вакцынуюцца пацыенты з груп рызыкі. Гэта дзеці з шасці месяцаў да трох гадоў, дзеці з трох гадоў і дарослыя з хранічнымі захворваннямі, асобы старэйшыя за 65 гадоў, медыцынскія работнікі, дзеці і дарослыя ва ўстановах з кругласутачным знаходжаннем, работнікі арганізацый, якія забяспечваюць жыццядзейнасць дзяржавы. Прышчэпка неабходная для работнікаў адукацыі, гандлю, транспарту, грамадскага харчавання, камунальнай сферы.

Усяго запланавана прышчапіць ад грыпу каля 40 % насельніцтва, прычым не менш за 75 % тых, хто знаходзіцца ў групах рызыкі. І апошняга паказчыка ўжо ўдалося дасягнуць.

— З груп рызыкі мы прышчапілі 75 %. Адзначу актыўнасць саміх медработнікаў — вакцыянавана 86 %, а таксама больш за 80 % дзяцей у дзіцячых дамах, школах-інтэрнатах. Асноўны этап вакцынацыі ў групах рызыкі завяршаецца ў пачатку лістапада. Магчымасць прышчапіцца за ўласныя сродкі яшчэ захоўваецца, — дадала **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ВЫСОЦКАЯ.**

### Што дапаможа пазбегнуць ВРВІ і COVID-19

ВРВІ — гэта вялікая група захворванняў, для якіх характэрны агульныя шляхі перадачы — паветрана-кропельны. Аб'ядноўвае іх і падабенства клінічных праяў. Узбуджальнікаў гэтых хвароб мноства — вядома больш за 200 вірусаў. Гэта як класічныя вірусы грыпу, парагрыпу, адэнавірусы, рынавірусы, так і нядаўна адкрытыя пнеўмавірусы і каранавірус.

— Каб развілося захворванне, патрэбны тры складнікі — узбуджальнік, успрымальны арганізм і шлях перадачы. Мы можам уздзейнічаць толькі на два апошнія, — адзначае **загадчык лабараторыі грыпу і грыпападобных інфекцый РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ШМЯЛЁВА.**

Найперш неабходна захоўваць сацыяльную дыстанцыю ў 1-1,5 метра. Прытрымлівацца прынцыпаў сацыяльнага дыстанцыявання, гэта значыць скараціць свае кантакты і змяніць мадэль паводзінаў — на 75 % зменшыць кантактаванне па-за межамі дома і на 25 % — на рабоце. Усё гэта будзе садзейнічаць зніжэнню захваральнасці на ВРВІ, грып і каранавірусную інфекцыю.

— Асобы з бессімптомным цячэннем і ў інкубацыйным перыядзе хваробы могуць знаходзіцца побач з намі, бо лічаць сябе здаровымі. Таму вельмі важнае выкарыстанне масак. Мы яшчэ непрацяглы час жывём з COVID-19, але папярэдні вопыт інфекцыйных хвароб сведчыць пра тое, што наяўнасць масак скарачае імавернасць інфікавання да 1,5 %, — падкрэсліла Вераніка Высоцкая.

Спецыяліст нагадала і пра гігіену — не варта забываць пра мыццё рук з мылам, калі ж гэта немагчыма, апрацоўваць іх антысептыкам. Дзецям і дарослым, якія пакутуюць на хранічныя хваробы, патрэбны больш жорсткі варыянт сацыяльнага дыстанцыявання і максімальнае абмежаванне кантактаў.

— Мы ў сваю чаргу прапрацоўваем кожны ачаг каранавіруснай інфекцыі, і наша работа накіравана на тое, каб перарваць яе распаўсюджванне, — запэўніла Вераніка Высоцкая.

### Каб рацыён не шкодзіў, а дапамагаў імунітэту

— Мы павінны памятаць, што нельга ўвесці адзін кампанент у рацыён і спадзявацца, што гэта нейкім чынам дазволіць нам не заразіцца. Наша харчаванне павінна быць комплекснае і рацыянальнае, — нагадала **загадчык аддзела грамадскага здароўя і сацыяльна-гігіенічнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Настасся КОСАВА.**

Наш рацыён павінен утрымліваць дастатковую колькасць асноўных нутрыентаў — бялкі, тлушчы, вугляводы, мікра- і макраэлементы, вітаміны. Штодзень мы мусім ужываць шэсць відаў прадуктаў. Гэта зерневыя (крупы і макарона), гародніна, малочнакіслыя прадукты, мяса (а таксама птушка і рыба), тлушчы і вада.

У перыяд пад'ёму захваральнасці ні ў якім разе нельга недаацэньваць гародніну і садавіну, якія з'яўляюцца крыніцай вітамінаў, мікра- і макраэлементаў, складаных вугляводаў — клятчаткі. Асабліва карысныя жоўты перац, спаржа, вішня, каперсы, якія багатыя на гліцын. А ён даказаў сваю актыўнасць у дачыненні да вірусаў. Не трэба забываць пра цыбулю і часнок, а таксама імбір — аналаг нашага часнаку, гэта прыродныя імунамадулятары. Яшчэ адзін прыродны стымулятар імуннай сістэмы — куркума, дакладней, куркумін, які там утрымліваецца. Лімон, чорныя парэчкі, шыпшына, журавіны, квашаная капуста, балгарскі перац у вялікай колькасці ўтрымліваюць вітамін С.

Малочнакіслыя прадукты важныя для падтрымання і аднаўлення біяфлоры нашага кішэчніка. Мяса, птушка і рыба з'яўляюцца крыніцай бялку, які ўдзельнічае ў сінтэзе імунных бялкоў. Неабходныя і тлушчы, хоць многія цяпер імкнуцца скараціць іх ужыванне. У рацыёне павінны быць і вада, а таксама морсы і іншыя напоі, якія ўтрымліваюць вітаміны. А вось прадукты, не ўласцівыя для нашага рацыёну, у перыяд павышэння захваральнасці лепш не ўжываць, каб дадаткова не напружваць арганізм.

**Калі вы пачынаеце хварэць,** рацыён павінен быць максімальна паўнацэнны. Бялкі, тлушчы і вугляводы ў дастатковай колькасці, максімум гародніны і садавіны, кісламалочныя прадукты, а таксама варта дадаць вітамінныя комплексы.

**Калі вы хварэеце,** рацыён павінен быць максімальна беражлівы, бо ўсе сілы арганізм аддае на работу імуннай сістэмы. Ежа павінна быць прыгатаваная адпаведным чынам, у прыватнасці, на пары, а яе прыёмы павінны быць частыя. Важна выключыць алкаголь, каўбасныя вырабы і ўсё тое, што ўтрымлівае вялікую колькасць спецый. А вось ужыванне вадкасці трэба павялічыць, гэта не толькі вада, але і свежыя сокі, морсы, гарбата з ліпай, мёдам, шалфеем, шыпшынай, багатымі на вітамін С.

**Калі вы ідзяце на папраўку,** неабходна падтрымаць кішэчнік пасля ўжывання супрацьвірусных і антыбактэрыяльных прэпаратаў. І тут на дапамогу прыйдуць кісламалочныя прадукты. Можна дадаваць гародніну і садавіну, тлустыя віды рыбы, яйкі.

— У перыяд пад'ёму захваральнасці важна адмовіцца ад дыет і пастарацца зрабіць свой рацыён разнастайным і збалансаваным, — рэзюмавала Настасся Косава.



### ЦІ ПРЫМАЦЬ СУПРАЦЬВІРУСНЫЯ ПРЭПАРАТЫ?

— Супрацьвірусных прэпаратаў не так і шмат, бо іх складана вырабіць. У прыватнасці, два выкарыстоўваюцца пры грыпе. Эфектыўнасць астатніх пакуль не даказана. Таму лепш не прымаць гэтыя прэпараты без прызначэння ўрача, — кажа Іна Карабан.

### Які тып масак больш надзейны?

— Любая маска — тканевая, марлевая, медыцынская — абараняе ад пранікнення віруса. Важна, ці правільна мы яе надзяваем, носім і знімаем. Калі мы пастаянна яе тузаем, не мыючы рукі, дакранаемся да твару, які сэнс насіць маску? — кажа Іна Карабан. — Падчас першай хвалі маскі насілі больш людзей. Цяпер раніцай у цалкам запоўненай маршрутцы добра калі два-тры чалавекі ў масцы. Гэта выклікае здзіўленне. Я разумею, што ўсе мы стаміліся, але гэта наша здароўе. Калі мы пра сябе не паклапоцімся, дык хто тады зробіць гэта за нас? Многія думаюць: ну захварэю — і вылечуся. А калі не вылечыцеся і загінеце? Такое пагарджанне мне незразумелае. Калі мы будзем усе разам выконваць тыя меры, якія прапануюць спецыялісты, значнага распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі не будзе.

**У асенні перыяд наш стол багаты на агародніну і садавіну, таму лепш аддаваць перавагу натуральным утрымальнікам вітамінаў. Вітамінныя комплексы будуць дарэчы вясной, калі прыродны рэсурс вычарпаны. Пры гэтым перад ужываннем такіх комплексаў лепш параіцца з урачом.**

Іна Карабан адзначыла, што аналіз паказаў: большасць захварэлых кантактавала з людзьмі без масак.

— Пытаеш, ці былі ў масках тыя, з кім вы кантактавалі. І 90 % людзей кажа, што не. Калі мы не будзем карыстацца мерамі прафілактыкі — простымі і недарагімі, то нельга разлічваць не заразіцца, — падкрэсліла спецыяліст.

Весткі з месцаў

# ЯНЫ СТАЛІ ПЕРШЫМІ...

**Пасведчанні народных майстроў уручаны днямі жыхаркам вёскі Плябанаўцы Марыі Уладзіславаўне Кажанеўскай і Алене Адольфаўне Барцэвіч. Яны першымі ў Бераставіцкім раёне ўдастоены такога ганаровага звання.**

Апроч іншых, звычных спраў, усё сваё дарослае жыццё гэтыя жанчыны мелі адну, бадай, самую любімую: яны ткалі. І такім чынам сталі актыўнымі ўдзельніцамі аматарскай творчасці пры мясцовым сельскім клубе. Уласнымі ўмелымі рукамі стварылі цэлую калекцыю дываноў для мясцовага Дома рамёстваў, выстаўлялі свае творы падчас раённых і абласных мерапрыемстваў. Летась, напрыклад, іх дываны і посцілкі два месяцы экспанаваліся ў выставачнай зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, дзе атрымалі прызнанне за аўтэнтычнасць, адметнасць і прыгажосць арнаментаў. У Марыі Уладзіславаўны і Алены Адольфаўны да сёння захоўваецца звыш 60 узораў пераборнага і закладнога ткацтва, распаўсюджанага на тэрыторыі прынёманскага рэгіёна...



Дырэктар Бераставіцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Юлія АТРУШКЕВІЧ, народны майстар Алена Адольфаўна БАРЦЭВІЧ і былы метадыст па этнаграфіі і фальклору Леанід ПАНАСЕВІЧ.





Народная майстрыца Марыя Уладзіслаўаўна КАЖАНЕЎСКАЯ.

Пасведчанні народных майстрых і памятныя сувеніры ткачыхам уручылі дырэктар Бераставіцкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці Юлія Атрушкевіч і былы метадыст па этнаграфіі і фальклоры, энтузіяст і пачынальнік справы па вылучэнні майстроў на званне народных Леанід Панасевіч.

Для вельмі сціплых вясковых жанчын, жыццё якіх прайшло ў цяжкай працы, а ўменне ткаць не лічылася чымсьці адметным, падобнае прызнанне і ўвага сталі сапраўднай падзеяй. Абедзве майстрыхі вельмі рады, што іх вырабы, якія гадоў колькі назад многія лічылі «днём учарашнім», сталі патрэбныя.

І сапраўды апошнім часам у нашым грамадстве назіраецца цікавасць да гісторыі і культуры свайго народа, душа якога жыве ў мове, у традыцыйных беларускіх рамёствах і промыслах. Такім чынам старадаўнія беларускія арнаменты пранікаюць у гарадское асяроддзе, іх элементы прысутнічаюць у афармленні лагатыпаў, прамысловай упакоўкі, рэкламы, кніжных выданняў, адзення, прадметаў побыту, інтэр'ераў, аб'ектаў гарадской архітэктуры.

...У вырабах плябанаўскіх ткачых таксама жыве душа, адметныя рысы малой радзімы — штосьці надзвычай каштоўнае, што, магчыма, цяжка выказаць словамі, але можна адчуць сэрцам...

**Святлана ГАНЧАРОВА, фота аўтара.**

Рэзананс

# З павагай да традыцый? З павагай да людзей

### «У прадуктах галоўнае — смак, яго якасць, але...»

**Шмат у чым пагаджуся з Ганнай Кагаркай *(гл. «Звязда» за 28 кастрычніка)*: упакоўка ў таварах, прадуктах, не самае галоўнае. І ўсё ж з ёю, як з адзеннем у чалавека: па ім сустракаюць. А калі так, то нашы, айчынныя прадукты можна лёгка прыняць за расійскія, бо амаль усе надпісы на іх і сапраўды зроблены па-руску.**

Чаму так адбываецца, размова, відаць, асобная і доўгая. Тут і зараз мне хацелася б сказаць аб тым, што прыемна здзівіла. Неяк у сваім халадзільніку я ўбачыла не заўсёднае *молоко питьевое*, а раптам... малако — пітное... Ну і далей — «Масавая доля тлушчу...», «Склад...». На ўпакоўцы, карацей, усё па-нашаму, па-беларуску.

Не стрымалася, адразу ж папыталася ў дачкі (мне трохі за 70 і сама я з-за каранавіруса ў крамы пакуль не хаджу), дзе яна брала такі дзіўны прадукт? І заадно папрасіла купіць яшчэ, калі, вядома ж, трапіцца...

Дробязь, а прыемна: клопатам сям'і і ледзь не назаўтра ў маім халадзільніку ад тых самых вытворцаў (ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат») з'явіліся масла салодкаваршковае несалёнае, кефір і тварог класічны.

Я доўга разглядала іх упакоўку. І як жа прыемна, што гэтыя добрыя прадукты *не сделаны*, а менавіта зроблены ў Беларусі! Зроблены мала таго, што з адборнага малака, дык яшчэ і «з павагай да традыцый» (там так і напісана), за якой, як мне падаецца, яшчэ і шчырая павага да вяскоўцаў, якія тое малако здабываюць, павага да сябе, да спажыўцоў і, вядома ж, да нашай роднай мовы.

**Любоў КІСЯЛЁВА,**

*г. Мінск.*

Чалавек — чалавеку

# «Я ПЕЧ НА РАЙ НЕ ПАМЯНЯЮ»

**...У нас з суседам дамы тыпавыя, гэта значыць, пабудаваныя па адным праекце і, на жаль, аднолькава халодныя, сырыя. Ён сказаў, што ў рамонт сваіх грошай укладваць не будзе, бо гэта, маўляў, не мае сэнсу, а я вось наадварот — усё ўпіраюся, нешта раблю. І, нягледзячы на гэта, перад пачаткам сезона па-ранейшаму заказваю дровы.**

Сёлета з імі неяк не склалася: у лясніцтве паабяцалі, паставілі ў чаргу. Я чакаў. Амаль два месяцы прайшло, а воз, як той казаў, ні з месца: усё недзе там, у лесе стаіць. І ў далёкім, відаць.

Таму я з фотаапаратам схадзіў у блізкі, у той, што пачынаецца адразу ж за маім участкам. Трохі паздымаў там, завітаў у лясніцтва. Сказаў, што дроў мог бы нарыхтаваць і сам вось з гэтых, напрыклад, старых, напалову абламаных вольхаў, асін, з вывернутай ветрам яліны... На шчасце, мне не адмовілі, падрыхтавалі адпаведныя паперы.

Пасля гэтага я стаў дома рыхтаваць бензапілу, а заадно яшчэ і тлумачыць сваёй унучцы, што гэта — шведка... Прафесійная... «А ты таксама прафесіянал?» — спытала дзіця.

Усяго на нейкае імгненне ўявіў, колькі ж дроў давялося парэзаць (прычым, пачынаючы яшчэ з двухручнай пілы, панароднаму — «Дружбы-2», і згадзіўся: «Што ёсць, тое ёсць: прафесіянал... Ды яшчэ і які...»

Але ж без тэхнікі цяжка прыйшлося б.

Як заўжды мотаблок выручае — наш, айчынны, зроблены як міні-трактар. Зручна ім кіраваць! Не паверыце, нават паміж дрэў у лесе. Праўда, поўны прычэп дроў трактарок, відаць, не «здужаў» бы, калі б не колы ад «масквіча» на тры парадкі большыя...

І вось — дровы нарэшце дома. І застаецца толькі папацець, пакуль пасячэш, пакуль спарадкуеш: паносіш ды складзеш на прасушку.

Зрэшты, у працэсе нарыхтоўкі гэта ўжо справа лёгкая, пасля якой застанецца хіба што прынесці дроў у хату, прапаліць у печы і адвесці душу: пагрэць паясніцу... Як там у Коласа? «Я печ на рай не памяняю».

**Аляксандр МАТОШКА,**

*Расонскі раён.*

Землякі

# «ХТО ЗА ШТО, А МЫ — ЗА КНІЖКІ І... ВЕНІКІ»

**«Я ў вёсцы ўсё сваё жыццё жыву, — кажа пра сябе Аляксандр Карпавіч Сайка, — і ніколькі аб тым не шкадую. Горад — гэта не маё. Мне зямля па душы, лес, поле... Я свой Ліпск толькі аднойчы пакідаў, калі служыў у войску ў вядомых Пячах пад Барысавам...**
**Што цікава, жонка Аляксандра Карпавіча таксама з'язджала з вёскі толькі раз: пасля школы паехала паступаць у Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. І паступіла, праўда, павучыцца ёй не ўдалося.**

— Саша перабльытаў усе мае планы, — успамінае Любоў Аляксееўна. — Замужжа, цяжарнасць... Але я не шкадую, бо мара мая ўсё роўна збылася: 36 гадоў аддала бібліятэчнай справе, хоць спецыяльнай адукацыі і не мела.

— Адкуль жа, — пытаю, — любоў да кніг, да чытання?

— У вёсцы наш род называлі мудранькім, — кажа Любоў Аляксееўна. — Дзядуля Кірыл ведаў мноства розных легендаў, паданняў. Ад яго мама навучылася, а потым і мне перадала. Я з маленства любіла кніжкі чытаць: казкі, вершы, байкі, потым беларуская, руская, замежная класіка, легенды... Я шмат па людзях хадзіла, запісвала, што дзе чула. Некаторыя з гэтых запісаў змешчаны ў кнізе «Ганцаўшчына. Край легендаў і талентаў народных», а таксама ў буклеце да 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. На святкаванні гэтага юбілею мне ўручылі набор прыгожага посуду. Я ім да сёння даражу...

Цікаўлюся, як пазнаёміліся будучыя сужэнцы?

— Дык у адной жа вёсцы нарадзіліся, — расказвае жанчына. — У адным класе вучыліся, хоць Саша за мяне і старэйшы. У пасляваенныя гады такое часта здаралася. Ён, дарэчы, яшчэ з малодшых класаў стаў да мяне заляцацца: падміргваў, чапляўся, за косы цягаў. А з войска вярнуўся і пажаніліся. Паўвека ўжо разам. Трох дзетак выгадавалі, сямёра ўнукаў расце.

— У вёску часта прыязджаюць, — дадае Аляксандр Карпавіч. — Традыцыя ў нас — разам, усёй сям'ёй, адзначаць вялікія святы, разам бульбу садзіць ды капаць, нарыхтоўваць сена... Кароўкі, праўда, няма ўжо — цяжкавата з ёй стала, а вось каня — трымаем. І свіней гадуем, розную птушку. У нас ладны прысядзібны ўчастак ды з гектар зямлі яшчэ ў полі (а раней дык і болей было). Бульбу садзім, буракі, гарбузы, авёс сеем. Дзеці заўсёды дапамагаюць. Хоць бацькі і самі стараюцца.

Аляксандр Карпавіч пасля службы ў войску працаваў трактарыстам — то ў калгасе, то ў мясцовым лясніцтве. Потым, калі можна так сказаць, зрабіў кар'еру — стаў леснікам і ў дадатак — займеў захапленне: прыахвоціўся... венікі вязаць. Прычым не маленькія, для лазні, а вялікія. Імі некалі тэрыторыю падмяталі на прадпрыемствах Ганцавіч, Брэста, іншых гарадоў.

— Лясніцтву план па нарыхтоўцы даводзілі, — успамінае гаспадар. — Так што я гэтай справай па абавязку заняўся. А потым неяк налаўчыўся, прывык і цяпер ужо кожную вольную хвіліну хто за што, а я за венікі. Падабаецца гэты занятак, ды і капейчына ў сямейным бюджэце ніколі не лішняя. За мінулую зіму, напрыклад, больш за восем тысяч іх здаў... І гэта ж без тых, што для лазні. З маленькімі, дарэчы, клопату больш. Матэрыял асаблівы патрэбен, спосаб прасушкі... З імі толькі здаецца, што проста ўсё, а на самай справе... Ёсць у мяне і сакрэты свае, і пастаянныя заказчыкі: падабаюцца мае венікі... Нарыхтоўшчыкі нават з Мінска ў наш Ліпск прыязджаюць. Тут не я адзін гэтай справай займаюся...

Аляксандр Карпавіч і сапраўды чалавек вельмі працавіты. Яму хоць дом будаваць, хоць жывёлу даглядаць, хоць нешта вырошчваць, хоць венікі вязаць... Няма ў вёсцы такой работы, якую б ён не ведаў, якую б не ўмеў.

— Закон жыцця такі: пакуль дыхаю — працую, — кажа пра сябе Аляксандр Карпавіч. — Шкада вось толькі, што на гармоніку іграць не навучыўся. Браты мае добра ўмелі, а ў мяне чамусьці не атрымалася.

...Так што надзеі цяпер хіба на ўнукаў-наступнікаў. У дачкі Святланы трое дзяўчат. Ужо дарослыя: Алеся працуе ўрачом, Таня — ветэрынарам, Даша — медсястрой. У сыноў Сяргея і Аляксандра таксама па двое дзяцей... Нехта, дасць бог, зайграе!

**Вячаслаў БУРДЫКА,**

*Ганцавіцкі раён.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# НА ЎСЕ ПРУЖАНЫ — ПАЛАЦЫК

## МАТЭРЫЯЛІЗАЦЫЯ МАРЫ АБ ПРЫГОЖЫМ ЖЫЦЦІ

Ён мае дзіўнаваты выгляд, нібы складзены з розных па памеры, форме і аблічы будынкаў. Адзін з чатырох пружанскіх помнікаў архітэктуры XIX стагоддзя — ёсць яшчэ сабор у імя Аляксандра Неўскага, касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, гандлёвыя рады «Белыя лаўкі» — палац Швыкоўскіх за апошнія два дзясяткі гадоў стаў галоўнай славутасцю горада, яго візітоўкай і своеасаблівым брэндам.

Гэта цяпер. А тады, у 50—60-я гады пазамінулага стагоддзя, пяцітысячны паватовы цэнтр Гродзенскай губерні мала чым мог пацешыць вока. Вузкія, амаль усе незабрукаваныя вуліцы, уздоўж якіх цягнуліся шэрыя драўляныя дамы і крамкі, пара храмаў, некалькі дзяржаўных установ... І раптам пасярод гэтай шэрасці — такі цуд. Нехта з даследчыкаў, матэрыялы якіх беражліва захоўваюцца ў цяперашнім музеі, назваў узвядзенне палацыка ў цэнтры Пружан матэрыялізацыяй мары аб лепшым і прыгожым жыцці, якога заўсёды трэба прагнуць. Тэзіс гэты застаецца актуальны заўсёды, хоць многае змянілася з тае пары. Думаю, варта згадаць асноўныя вехі гісторыі «Пружанскага палацыка». Яго гаспадары дакладна таго вартыя. Ды і палац адзіны на Беларусі, які застаўся ў першапачатковым выглядзе з часоў пабудовы.

Пасля падаўлення касцюшкаўскага паўстання ў 1794 годзе, землі, якія называліся Пружанскі «ключ» імператрыца Кацярына ІІ шчодрай рукой дaравала графу Румянцаву-Задунайскаму. У пачатку XIX стагоддзя Румянцавы прадалі маёнтак аднаму тайнаму саветніку, а праз шэсць гадоў яго набылі Швыкоўскія, прадстаўнікі заможнага шляхецкага роду. На працягу амаль васьмі дзесяцігоддзяў яны гаспадарылі тут, з гэтым прозвішчам звязаны слава і росквіт пружанскага маёнтка.

## ПА ЗАКОНЕ «ВЕКАВЫХ ПРАЎДАЎ»

Сваім з'яўленнем палац абавязаны Валенцію Швыкоўскаму, які стаў тут гаспадаром у 1843 годзе. Нарадзіўся Валенцій каля 1817 года, адукацыю атрымаў у Дэрпцкім універсітэце (Дэрпт — цяпер Тарту ў Эстоніі). У 1841 годзе Валенцій ажаніўся з Германіяй Важынскай. Сучаснікі называлі маршалка Пружанскага павета вялікім эрудытам, сумленным грамадзянінам і патрыётам. Яны з Германіяй былі вельмі адукаваныя людзі. Бібліятэка іх налічвала амаль паўтары тысячы тамоў выданняў на польскай, рускай, нямецкай, французскай мовах. Швыкоўскія адкрывалі народныя школы для навучання вясковых дзяцей, спрыялі культурнаму развіццю свайго краю: у горадзе была адкрыта грамадская бібліятэка, арганізавана конная пошта і пабудаваны паштовы тракт. Па тым часе гэта было інфармацыйным прарывам. Папулярная і ўплывовая ў той час газета «Русский инвалид» змясціла ў 1860 годзе артыкул пра павятовы горад Пружаны і яго маршалка.

Валенцій Пятровіч жыў і працаваў у тых умовах, пры той уладзе, але наўрад ці спадабаліся б губернскаму альбо яшчэ вышэйшаму кіраўніцтву погляды маршалка. Засталіся яго лісты з эміграцыі, куды трапіў Швыкоўскі, як і многія патрыёты свайго краю, пасля паўстання 1863 года. Былі ў пісьме такія радкі: «Весці з краю заўсёды тыя ж самыя: бяда, смутак, нястача і ўбоства агульныя. Расце сквапнасць царскіх катаў: чаго нельга ўкрасці, тое знішчае чужая мова і чужая прывіваецца вера. Сэрца рвецца перад гэтай страшнай карцінай маральнай і матэрыяльнай пакуты народа... У грамадскім жыцці распад і адмаўленне веры, сям'і і найсвяцейшых праўдаў...» Самі яны з жонкай жылі па законах тых самых «векавых праўдаў». І ім пашанцавала. Гэта быў надзвычай рэдкі выпадак, калі сасланаму гаспадару дазволілі вярнуцца ў свой маёнтак. Германія, якая Пружанскі палацык не пакідала ні на дзень, ва ўсе інстанцыі накіроўвала пісьмы і звароты з просьбамі за мужа. І была пачутая.

Лёс адвёў ім яшчэ многа шчаслівых гадоў у любімым імі палацыку, дзе яны прымалі дарагіх сваіх гасцей — мастака Напалеона Орду, пісьменніка Юзафа Крашэўскага, іншых вядомых навукоўцаў і людзей мастацтва, займаліся ўлюбёным сваім гаспадарствам. Германія памерла першая, Валенцій дажываў свой век у Варшаве. Але пахаваны яны разам у Пружанах. Магіла Швыкоўскіх на каталіцкіх могілках у Пружанах і цяпер знаходзіцца ў здавальняючым стане.

## АД ІНТЭРНАТА ДА МУЗЕЯ

Пашанцавала і палацыку, па-першае, з наступнай гаспадыняй, ёй стала Вера Кляйнміхель, а па-другое, з тым, што ён перажыў і рэвалюцыі, і войны ды застаўся стаяць. Вера Уладзіміраўна Кляйнміхель, сваячка Наталлі Ганчаровай, жонкі Пушкіна і пляменніца сяброўкі апошняй імператрыцы Аляксандры Фёдараўны, рэдка жыла ў Пружанах. Прыдворная дама часта здавала маёнтак у арэнду, але заняпаду яго не дапусціла. За польскім часам палацык займала павятовае староства, у вайну — штаб генерала Гудэрыяна, потым інтэрнат нямецкіх афіцэраў, пазней інтэрнат савецкіх афіцэраў, пасля вайны — дзіцячы садок і стаматалагічная паліклініка. А ў 1990 годзе даследчык напіша: «Сучаснае становішча сядзібы адчайнае. Будынак у страшэннай занядбанасці. Зусім запушчаны парк. Дрэвамі і хмызнякамі зарос сядзібны падворак. Ён быццам сарамліва хавае тое, што засталося ад палацыка. Такая рэчаіснасць».

Але будынку зноў усміхнулася фартуна. Яго доўга збіраліся рэстаўраваць, пазней — доўга аднаўлялі, і нарэшце ў 1999 годзе адкрылі. Сюды пераехаў краязнаўчы музей, які стаў называцца музей-сядзіба «Пружанскі палацык». За два дзесяцігоддзі сядзіба стала градска-культурным і навуковым цэнтрам Пружан. Тут праводзяцца літаратурныя і музычныя вечарыны, канферэнцыі па захаванні гістарычнай спадчыны, мноства розных асветніцкіх мерапрыемстваў, выстаўкі.

**Дырэктар музея Юрый ЗЯЛЕВІЧ** правёў кароткую экскурсію па залах, якія абсталяваны ў стылі шляхецкай сядзібы канца XIX — пачатку XX стагоддзя. На першым паверсе знаходзяцца салон-гасцёўня, Паляўнічы кабінет, Кветкавая зала, Зімовы сад, дзе можна ўбачыць мэблю, карціны, гадзіннікі той эпохі. Тут жа знаходзяцца тры выставачныя залы. Памяшканні для выставак ёсць і на другім паверсе. У адным з іх, напрыклад, зараз экспануюцца карціны Анатоля Жалудко. А ў «Іконнай зале» можна ўбачыць работы іканапісцаў канца XVIII — пачатку XX стагоддзя. На выстаўцы пад назвай «Res Sacrae» (Сакральная рэч) прадстаўлены прадметы праваслаўнага рэлігійнага культу, выяўленыя на тэрыторыі раёна і падораныя святарамі. Ёсць харугва, якую распісаў невядомы аўтар. Некаторыя даследчыкі мяркуюць, што гэта рука Мікалая Чурабы, вядомага брэсцкага мастака.

## «ТАЕМНАЯ ВЯЧЭРА» З ВАРАНІЛАВІЧ І ЯЕ ЗАХАВАЛЬНІЦА

А цяпер у адной з залаў упершыню на ўсеагульны агляд выстаўляецца ўнікальны экспанат — фрагмент надбрамнай драўлянай разной іконы «Таемная вячэра», якая ў свой час узвышалася над Царскай брамай Спаса-Праабражэнскай царквы ў вёсцы Варанілавічы.

Гэта толькі ўявіць: нейкі тутэйшы майстар ажно ў 1580-м ці можа ў 1590-м з дрэва выразаў сапраўдны абраз. А многія ж здзіўляюцца, адкуль узяўся ўнікальны самавучка Мікалай Тарасюк, што выразаў свой драўляны люд? На гэтай зямлі спрадвеку жылі такія ўмельцы...

Дык вось царква са сваёй драўлянай брамай (апошняя, дарэчы, цяпер у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь) спакойна служыла людзям да 1962 года. Менавіта ў гэтым годзе з Саўміна БССР прыйшоў цыркуляр, які прадпісаў пераабсталяваць царкоўны будынак пад школу. Людзі, вядома, адстойвалі царкву, але ж мясцовыя ўлады праявілі «ініцыятыву». У выніку ў 1968 годзе царкву наогул разабралі, драўніну перавезлі ў вёску Манчыкі і дабудавалі спартыўную залу да школы. Ну а царкоўную маёмасць спасціг розны лёс. Найбольш каштоўная яе частка, названая брама, варанілавіцкі летапіс, некаторыя іконы пераехалі ў Мінск, папоўнілі калекцыі музеяў. Нешта перадалі Ружанскаму прыходу, астатняе проста спалілі. Перад тым як кінуць старадаўнія драўляныя іконы ў вогнішча, іх секлі на часткі. Пра гэта расказала пазней жыхарка Варанілавіч Ніна Уладзіміраўна Новік. Вось так, відаць, рассеклі і "Таемную вячэру". Як ацалела верхняя частка з лікамі, жанчына не ведала. Яе яна знайшла на дарозе за вёскай. Жанчына падабрала яе і ўсё жыццё беражліва захоўвала. А перадала ў музей незадоўга да сваёй смерці па просьбе пружанскага святара Іосіфа Балюка. Айцец Іосіф да свайго скону маліўся за Ніну і яе сваякоў у знак удзячнасці.

На невялікай дошчачцы даўжынёй 103 см і шырынёй 16 см вясковым майстрам адлюстравана адна з найвялікшых у біблейскай гісторыі падзей: апошняя вячэра Ісуса Хрыста і дванаццаці апосталаў, падчас якой Гасподзь устанавіў таінства Еўхарыстыі, прадказаў здраду Іуды, сваю смерць і ўваскрэсенне, будучы лёс усяго свету. Цяпер яна выстаўлена на агляд.

...Супрацоўнікі палацыка вельмі ганарацца сваім домам і стараюцца падтрымліваць яго годна, каб душы Валенція і Германіі былі спакойныя, нават калі яны захочуць зірнуць на свой стары маёнтак. Кажуць жа, што кожны замак ці палац хоць аднойчы наведваюць прывіды.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота аўтара і з архіва музея.**



Дырэктар музея Юрый ЗЯЛЕВІЧ.



Ікона з Варанілавіч.



Інтэр'ер Зімовага саду і Паляўнічага кабінета.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# БУЛЬБУ ЯДУЦЬ, БУЛЬБУ ХВАЛЯЦЬ...

## УСЁ ФІЯЛЕТАВА

Мэта селекцыянераў не ў тым, каб парадаваць едакоў, што засумавалі ад аднастайнасці. Бульба з каляровай мякаццю каштоўная не толькі сваім незвычайным выглядам.

— Высокае ўтрыманне антыаксідантаў — асноўная вартасць новага сорту, — адзначае суразмоўца. — Чэмпіён сярод гародніны па колькасці антыаксідантаў — брокалі. Наш новы сорт бульбы змяшчае гэтыя рэчывы на тым жа ўзроўні, што і гэты від капусты.

Бульба з каляровай мякаццю — фаварыт заходніх дыетолагаў. Сёння ў многіх краінах свету модны кірунак селекцыі і кулінарыі — гатункі картоплі, у якой мякаць клубняў мае інтэнсіўную яркую афарбоўку: фіялетавую, ружовую, сінюю або чырвоную. Змяняючы колер, «другі хлеб» набывае і новыя карысныя ўласцівасці. Даказана, што ўжыванне ў ежу каляровай бульбы станоўча ўплывае на здароўе сэрца, умацоўвае сценкі крывяносных сасудаў, перашкаджае развіццю анкалогіі і значна паляпшае зрок. Акрамя таго, каляровыя сарты бульбы адрозніваюцца высокім утрыманнем інсуліну, а значыць, карысныя людзям, якія хварэюць на цукровы дыябет. Чым больш інтэнсіўная афарбоўка мякаці бульбы, тым больш антыаксідантаў і інсуліну ўтрымліваюць клубні.

Дарэчы, аб старэнні. У Паўднёвай Карэі вось ужо каля дзесяці гадоў з бульбы з каляровай мякаццю вырабляюць амаладжальную касметыку і чыпсы, ад якіх не таўсцеюць.

Ну, і пра «едакоў, што засумавалі». Георгій Іванавіч кажа, што на смак каляровая бульба не адрозніваецца ад звычайнай і гатуюць яе гэтак жа, як звычайную. А вось па знешнім выглядзе самыя простыя стравы — напрыклад, пюрэ або смажаная бульбачка з салам — з фіялетавых клубняў атрымліваюцца незвычайнымі.

— Каб колер застаўся яркі, пры варцы бульбы трэба падсольваць халодную ваду, а пры смажанні — саліць картоплю да таго, як яна «зашкварчэла». А лепш за ўсё запякаць яе ў духоўцы ў мундзірах, — раіць спецыяліст.

Назва новаму сорту пакуль не прыдумана.

— Гэта не так проста, як здаецца, — кажа навуковец. — Справа ў тым, што назвы сартоў культурных раслін не павінны паўтарацца ва ўсім свеце.

Менавіта таму многія айчынныя сарты бульбы (і не толькі) носяць беларускамоўныя імёны.

## МЭТАВАЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ

Зрэшты, і селекцыя бульбы больш звыклага выгляду сёння патрабуе сучасных падыходаў. Ужо не патрэбныя ўніверсальныя сарты бульбы. Наадварот, запатрабаваная бульба «мэтавага прызначэння», расказалі мне селекцыянеры. Напрыклад, ёсць асобная катэгорыя сартоў для вытворчасці бульбапрадуктаў (чыпсаў, фры і г. д.).

— Для іх характэрна нізкае ўтрыманне рэдуцыруючых цукроў, — адзначае Георгій Піскун. — Калі такіх больш, чым трэба, прадукт будзе не жоўценькі, а карычневы. Акрамя таго, клубні для атрымання чыпсаў павінны быць 40-60 мм у дыяметры, а для прыгатавання бульбы фры — даўжынёй ад 9 да 11 см.


Доктар навук Георгій ПІСКУН разважае, як назаве вынайдзены ім новы сорт бульбы.

***Для смажання і супу*** падыходзяць сарты салатнага тыпу — яны не разварваюцца з прычыны нізкага ўтрымання крухмалу. Ідэальны выбар, калі хочацца смажаных бульбачкі, — «Скарб» і «Брыз», яны самыя любімыя насельніцтвам. Самы новы сорт салатнага тыпу беларускай селекцыі — «Першацвет».

***Для пюрэ*** лепш выбіраць разварыстыя крухмалістыя сарты — напрыклад, «Журавінка», «Рагнеда», «Вектар».

— «Вектар» быў унесены ў дзяржрэестр у 2014 годзе, — адзначае Георгій Іванавіч. — На пасяўны матэрыял гэтага сорту заўсёды вялікі попыт у прыватнікаў.

Па часе выспявання клубняў сарты бульбы дзеляцца на раннія, сярэдняранія, сярэдняспелыя, сярэдняпознія і познія.

— Але позняй бульбай цяпер ніхто не займаецца. Гэтыя сарты з перыядам вегетацыі каля 140 дзён непрыдатныя для нашых умоў — ім не хапае сонейка і цяпла, а ў кастрычніку, калі іх трэба ўбіраць, часам па начах іх можа падмарожваць.

Усе сарты, якія ўносяцца ў рэестр, спыняюцца на ўзроўні сярэдняпозніх — тых, якія, калі высадзіць іх да сярэдзіны мая, цалкам выспяваюць да 1 верасня. І пры захаванні не страчваюць смакавых уласцівасцей да наступнага ўраджаю.

*— Кажуць, клімат змяніўся, і цяпер бульба не надта добра адчувае сябе ў нас...*

— Гэта няпраўда. Сапраўды, стала цяплей, і ў Беларусі з'явілася новая кліматычная зона. На Віцебшчыне глебава-кліматычныя ўмовы цяпер такія, якія гадоў 30 таму яны былі на Міншчыне, а на поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей умовы вырошчвання раслін зараз такія ж, як на поўначы Украіны. Пры гэтым мы бачым паўтарэнні засух, больш частыя сталі праліўныя дажджы. Да цвіцення дождж бульбе не патрэбны: расліна сілкуецца за кошт клубня, а ў клубні каля 80 % вады. Максімум вільгаці бульбе трэба атрымаць у перыяд фарміравання клубняў — у ліпені—жніўні. Гэтым летам засуха была ранняй, і ўраджай бульбы ранніх сартоў сабралі па краіне ніжэйшы, чым чакалася. А вось умовы для сярэдняспелых і сярэдняпозніх сартоў склаліся аптымальныя, таму і ўраджай быў добры.



Спецыяліст рэкамендуе на дачных і прысядзібных участках высаджваць бульбу мінімум трох сартоў — раннюю, сярэдняспелую і сярэдняпознюю. Тады вы гарантавана будзеце з ураджаем, нягледзячы на капрызы надвор'я. Вельмі важна для прыватнікаў выбіраць сарты, устойлівыя да бульбяной нематоды і фітафтарозу. З новых гэта «Рагнеда», «Рубін», «Гарантыя». З сярэднеранніх да хвароб найбольш устойлівы «Маніфест». З ранніх — «Лілея».

Тое, што раннія сарты не захоўваюцца, — міф. Іншая справа, што раннюю бульбу лепш ужываць у ежу адразу, таму што ў працэсе захоўвання губляюцца яе смакавыя якасці.

— На працягласць захоўвання бульбы ўплывае біялагічны перыяд спакою раслін. Напрыклад, у сорта «Скарб» перыяд спакою — 105 сутак, а ў «Вектара» — 60 сутак, потым клубні прарастаюць. Есці праросшую бульбу можна (калі вы захоўвалі яе ў цемры), але клубні становяцца вялыя і не такія смачныя.

*— А калі гаварыць пра смак — якія сарты вы параілі б дачнікам і сельскім жыхарам для вырошчвання на сваіх участках?*


Так выглядае кусцік фіялетавай бульбы.

— Не існуе ідэальнага для ўсіх сорту. Сарты (адзін або некалькі) трэба падбіраць індывідуальна — пад свой густ. І, зразумела, пад сваю глебу. Але ў любым выпадку пасяўны матэрыял варта мяняць раз у тры гады. Паступова расліны выраджаюцца, у іх назапашваюцца вірусныя хваробы і рэзка зніжаецца ўраджайнасць. Калі сорт вам даспадобы — пасадзіце яго і на наступны год, але яго пасяўны матэрыял набудзьце зноў, больш высокай рэпрадукцыі.

## ЕЖА БЕДНЫХ? ЦІ БАГАТЫХ?

Каляровая бульба — не вынаходніцтва трэцяга тысячагоддзя. Спрадвеку яна расце ў перуанскіх Андах. Проста канкістадоры вывозілі з Амерыкі толькі расліны, клубні якіх мелі светлую мякаць: усе астатнія еўрапейцы лічылі неядомымі. І толькі цяпер, на хвалі моды на здаровае харчаванне, пра каляровую бульбу ўспомнілі еўрапейскія селекцыянеры.

Гісторыя ўжывання ў ежу бульбы пачалася тысячы гадоў таму: індзейцы пакланяліся гэтай расліне, лічачы яе адушаўлёнай. У 1565 годзе бульба была ўпершыню прывезена ў Вялікабрытанію, але не спадабалася англічанам. Ды і медыкі перасцерагалі: «Тых, хто ўжывае бульбу, чакаюць трагічныя наступствы». На сталах еўрапейскіх арыстакратаў стравы з бульбы пачалі з'яўляцца ў 1610—1620-х гадах. У Францыі тады вырошчвалі бульбу як дэкаратыўную расліну: букеты з яе кветак дарылі дамам.

Прынята лічыць, што чым бяднейшае насельніцтва, тым больш бульбы яно есць. Але ў пачатку трыумфальнага шэсця гэтага караняплода па Еўропе было не так. І ў нашы дні гэта не так. Па-першае, навукоўцы высветлілі, што бульбяны крухмал неабходны мозгу для эфектыўнай работы і нават павышае разумовыя здольнасці. Па-другое, сучасныя дыетычныя сарты бульбы (у прыватнасці, з каляровай мякаццю) спецыялісты па харчаванні актыўна ўключаюць у дыеты здаровага спосабу жыцця.

Першым урачом, які загаварыў пра карысць бульбы, стаў ваенны фармацэўт Антуан Парманц'е. Сёння ў Францыі гэтаму вучонаму стаіць помнік з надпісам: «Дабрадзею чалавецтва»: падчас Рэвалюцыі 1789 года бульба выратавала народ ад голаду.

У Расію бульбу прывёз у канцы XVII стагоддзя Пётр І. У XIX стагоддзі банальная смажаная бульба была стравай, якую падавалі на балях, — называлі яе «бульба а-ля Пушкін». Легенда гаворыць, што для сваіх сяброў вялікі паэт часціў і смажыў модную агародніну ўласнымі рукамі. На землях Рэчы Паспалітай бульба з'явілася прыкладна ў той жа час, што і ў Расіі. І таксама была пратэжэ венцаносца — яе прадставіў паддадным кароль Ян Сабескі. Першыя беларускія сарты бульбы з'яўляюцца ў 1860-х гадах. А РНПЦ па бульбаводстве вядзе сваю гісторыю з 1929 года. За амаль стагоддзе айчыннымі селекцыянерамі было раянавана каля 120 сартоў.



А гэта яе лісты і кветкі — дарэчы, прыгожыя. І не дзіўна, што некалі ў Францыі бульбу лічылі дэкаратыўнай раслінай.



## З ЗАМЕЖНЫХ САРТОЎ КАШУ НЕ ЗВАРЫШ

Штогод у Дзяржкамісію інстытут падае 1-2 сарты бульбы. У савецкія гады — менш. Была вялікая канкурэнцыя, кажа Георгій Іванавіч. Але канкурэнцыя вялікая і цяпер.

— У Дзяржаўным рэестры Беларусі — 152 сарты бульбы, з якіх 47 — беларускай селекцыі. На дзяржаўным выпрабаванні пастаянна знаходзяцца дзясяткі замежных сартоў бульбы, — растлумачыў суразмоўнік. — З замежных асабіста мне бліжэй нямецкія сарты фірмы «Норыка». Па смаку яны падобныя на нашу, беларускую бульбу. А ў цэлым, замежныя сарты — не разварыстыя.

Новыя сарты бульбы з'яўляюцца шляхам гібрыдызацыі — працай кажучы, апыленя. Са 100 000 узораў з новым генатыпам пасля дзевяці гадоў селекцыйных выпрабаванняў застаецца толькі адзін. Які і павінен вытрымаць дзяржаўныя выпрабаванні па 58 паказчыках на 12 участках у розных глебава-кліматычных зонах нашай краіны. У прыватнасці, новы сорт павінен паказваць ураджайнасць не ніжэй як 60—70 тон з гектара. Яшчэ адзін паказчык: пры выкопванні куста павінны быць раўнамерна прадстаўлены буйная, сярэдняя і дробная фракцыі клубняў. Калі пераход рэзкі — толькі буйная і дробная бульба, без «сярэдняй», калі клубні няправільнай формы — сорт бракуюць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ВЯСЁЛКА Ў ТАЛЕРЦЫ

Ну і на завяршэнне — некалькі рэцэптаў з фіялетавай бульбай, каб не разгубіцца, калі з'явіцца магчымасць гатаваць навінку.

### ЦЁПЛАЯ САЛАТА «ЛІСТАПАД»

750 г адваранай у мундзірах бульбы з фіялетавай мякаццю чысцім, рэжам кубікамі і выкладваем у салатнік. Дадаём па 200 г дробна нарэзанага салодкага чырвонага перцу і кораня сельдэрэя, 2 ст. л. дробна нарэзанай зеляніны (кроп, пятрушка і зяленая цыбуля). Акуратна змешваем. Запраўляем салату падліўкай: 1/2 шклянкі аліўкавага алею, 1/4 шклянкі сталовай гарчыцы, 3 ч. л. свежавыціснутага лімоннага соку, 1 ч. л. солі, 1/4 ч. л. чорнага свежамолатага перцу.

### ПЮРЭ «АДПАЧЫНАК НА МОРЫ»

6 буйных бульбін фіялетавага колеру ачысціць і зварыць у падсоленай вадзе да мяккасці. Пераварваць каляровую бульбу не трэба, інакш знікне яркі колер мякаці. Дастаткова 20 хвілін пасля закіпання вады. 1-2 ч. л. масла растапліваем у 100 мл малака, змешваем з дробна нарэзанай зялёнай цыбуляй. Дадаём 3 ч. л. нацёртага на дробнай тарцы сыру, соль і молаты чорны перац на смак. Бульбу ўзбіваем міксерам, уліваем малако з маслам, цыбуляй і сырам і яшчэ раз перамешваем.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-46162 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – котельня), общей площадью 147,6 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Солобутина, 12/1

Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 424385990401000747, площадью 0,0550 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания котельной), расположенном по адресу: Новогрудский р-н, г. п. Любча, ул. Солобутина, 12/1. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), площадь 0,0550 га; ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадь – 0,0175 га

Начальная цена продажи лота 532,31 руб. (пятьсот тридцать два рубля тридцать одна копейка) с учетом НДС

Сумма задатка – 53 руб. (пятьдесят три рубля)

**Новогрудский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231400, г. Новогрудок, ул. Гродненская, 103, тел. 8-01597-239-52**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 04 декабря 2020 г. в 14.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 23.11.2019 г.

**Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 02 декабря 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

Лот 1: автомобиль грузовой седельный тягач марки МАЗ 642508-230, 2007 г. в., гос. № АН 9463-7 (количество осей – 3, колесная формула 6x6, полная масса 31450 кг, двигатель дизельный объемом 14860 см. куб., 243 кВт/330 л.с., тип трансмиссии – механическая). Начальная цена продажи – 8 400 руб. (восемь тысяч четыреста рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 840 руб. (восемьсот сорок рублей)

Лот 2: полуприцеп бортовой марки МАЗ 938662, 2007 г. в., гос. № А3375В-7 (количество осей – 2, полная масса 31 000 кг, грузоподъемность 23 000 кг).
Начальная цена продажи – 4 400 руб. (четыре тысячи четыреста рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 440 руб. (четыреста сорок рублей)

**Продавец – открытое акционерное общество «Химремонт», 246026, г. Гомель, ул. Химзаводская, 4, тел. +375-232-23-12-69**

